ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -надбаўку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-86
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
» абвестак	7-81

ПЯТНІЦА, 20 чэрвеня 1930 г.

№ 142 (3740)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам Ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б наперад да новых баёў і перамог на фронце будаўніцтва сацыялізму

Рэзалюцыя Менскага партактыву па дакладу т. Галадзеда аб рэзультатах XIII зьезду КП(б)Б

1. Заслухаўшы даклад тав. Галадзеда аб рэзультатах 13-га зьезду КП(б)Б, актыў Менскай арганізацыі цалкам і поўнасьцю далучаецца да ўсіх пастаноў 13-га зьезду КП(б)Б.

2. Актыў Менскай арганізацыі канстатуе, што 13-ы зьезд КП(б)Б, ва ўсёй сваёй рабоце прасякнуты непрымірымай барацьбой супроць правых і «левых» апартуністых і прымірэнчых адносін да іх, непрымірымай барацьбой за чыстату і артадаксальнасьць установак, якія даваліся, і разьвіцьцё партыйнай лініі партыйнымі органамі і паасобнымі кіруючымі таварышамі — яшчэ больш узмацніў сталёвае адзінства і ідэёвую маналітнасьць, з якімі КП(б)Б прышла на свой 13-ы Усебеларускі зьезд.

3. 13-ы зьезд КП(б)Б праймоў пад знакам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, яшчэ большага выкоўваньня і ўзмацненьня баяздольнасьці КП(б)Б у палітычнай барацьбе з рэвізіянізмам, з правымі, з нацыянал-апартуністымі, з поўтрацкістымі і трацкісцкімі рэцыдывам, у барацьбе з усялякімі недахопамі ў разгортваньні самакрытыкі, «не зважаючы на асобы», і спробамі заглушыць і абмежаваць самакрытыку.

4. Актыў Менскай арганізацыі вітае бальшавіцкую рашучасьць і выразнасьць установак 13-га зьезду ў пытаньнях барацьбы з правымі і «левымі» апартуністымі і прымірэнцамі, установак, якімі зьезд у яшчэ большай меры ўзьняў баяздольнасьць партарганізацый і ўзброіў іх на далейшую цьвёрдую і рашучую барацьбу на два фронты, за генэральную лінію партыі. У поўнай адпаведнасьці з установкамі зьезду Менскі актыў падкрэсьлівае, што барацьба з правай небясьпекай ня скончана, як ня скончана і барацьба з «левымі» загібамі, якія ўзмацняюць пазыцыі правага ўхілу, хоць шкода якіх сацыялістычнаму будаўніцтву відавочна выявілася ў пройдзеным этапе калгаснага будаўніцтва. Самым рашучым чынам працягваючы гэту барацьбу, Менская арганізацыя пад кіраўніцтвам ЦК і АК КП(б)Б будзе даваць адпор усялякамі прымірэнцтву як да правай небясьпекі, так і да «левых» загібаў.

Адначасова актыў падкрэсьлівае правільнасьць пастаноў 13-га зьезду КП(б)Б аб тым, што галоўнай і асноўнай небясьпекай на даным этапе застаецца праваапартуністычны ўхіл. Аб гэтым сьведчаць асобныя выступленьні, а якіх найбольш яскравым і цынічным было выступленьне Мамаева, артыкул якога ў дыскусійным лістку «Правды» зьяўляецца закончанай плятформай правага ўхілу і доказам перарастаньня правых апартуністых у агентуру клясавага ворага ўнутры партыі.

Самым рашучым чынам асуджаючы ўвесь комплекс праваапартуністычных поглядаў, якія знайшлі выразнае адлюстраваньне ў артыкуле Мамаева, і ганьбуючы іх, як наглую праяву кулацкай ідэалёгіі, і падкрэсьліваючы, што гэтыя погляды не сумяшчаюцца з прыналежнасьцю да ленінскай партыі, актыў Менскай партыйнай арганізацыі пераконан, што 16-ы Усесаюзны партыйны зьезд патрабуе ад былых лідэраў правай апазыцыі самага вычарпальнага і безагаворачнага прызнаньня сваіх памылак і барацьбы на справе з тымі поглядамі, якіх яны абаранялі супроць усёй партыі і супроць Ленінскага ЦК УсеКП(б).

5. Актыў Менскай партыйнай арганізацыі лічыць, што ва ўмовах БССР праваапартуністычны ўхіл, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, знайшоў сваю найбольш яскравую праяву ў разгромленай, але яшчэ канчаткова не ліквідаванай, прышчэпаўшчыне, рэцыдывы якое могуць мець месца ў асобных выпадках, калі партыйныя арганізацыі, ня гледзячы на катэгарычныя ўказаньні 13-га зьезду, аслабяць сваю рэвалюцыйную пільнасьць. Гэты праваапартуністычны ўхіл знайшоў таксама сваю выразную праяву ў нацыянал-апартунізьме, які набыў найбольш закончанае адлюстраваньне ў праваапартуністычных установках т.т. Жылуновіча, Чарвякова, Бэйліна і інш.

Актыў цалкам і поўнасьцю падтрымлівае тэзісы 13-га зьезду КП(б)Б аб тым, што супраціўленьне клясавага ворага сацыялістычнаму наступленьню будзе праходзіць ва ўмовах БССР пераважна пад прыкрыцьцём нацыяналізму і што галоўную небясьпеку прадстаўляе на даным этапе беларускі нацыянал-дэмакратызм, які зьяўляецца агентурай беларускага нацыянал-фашызму Заходняй Беларусі, вернага агента і саюзьніка польскай фашысцкай контр-рэвалюцыі. Гэтаму галоўнаму ворагу Менская арганізацыя будзе і ў далейшым даваць самы рашучы адпор, разам з тым ні на мінуту не забываючы аб небясьпецы рашучай барацьбы з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, барацьба з якім зьяўляецца зарукай больш пасьпяховай барацьбы і з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, а таксама не забываючы аб неабходнасьці рашучай барацьбы з польскім шавінізмам, яўрэйскім нацыяналізмам, шавінізмамі ўсіх нацыянальных адценьняў, з найбольш агіднай праявай праявай шавінізму — зантысэмітызмам.

Заклікаючы ўсю партыйную арганізацыю напружыць сілы для выкананьня задач, пастаўленых 13-м зьездам КП(б)Б у галіне барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, як галоўнай небясьпекай у БССР на даным этапе, а таксама з вялікадзяржаўным расійскім, яўрэйскім і польскім шавінізмам, шавінізмамі ўсіх іншых адценьняў, актыў настойліва падкрэсьлівае ўсю важнасьць пастаноў 13-га зьезду КП(б)Б аб узмацненьні работы ў галіне беларусізацыі, для ўзмацненьня пралетарскага кіраўніцтва асноўнымі сялянскімі масамі БССР, а таксама для разьвіцьця беларускай пралетарскай культуры.

6. Актыў Менскай партыйнай арганізацыі з асаблівай сілай падкрэсьлівае пастановы 13-га зьезду партыі аб ходзе выкананьня 5-цігадовага пляну разьвіцьця прамысловасьці БССР, як важнейшую задачу ў галіне ўзьняцьця ўсёй нашай народнай гаспадаркі. Падкрэсьліўшы нашы вялізарныя дасягненьні (рост прадукцыі супроць летаішняй на 72 проц., гігантскі размах прамысловага будаўніцтва, павялічэньне ўдзельнай вагі прамысловасьці і ўзмацненьне яе вядучай ролі ў разьвіцьці і сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, рост рабочае клясы, рэзкае—на 46,8 проц.—зьніжэньне беспрацоўя, паляпшэньне матар'яльнага становішча рабочае клясы і г. д.), зьезд правільна фіксуе ўвагу партыі на неабходнасьці ўзмацненьня барацьбы за прамфінплян, асабліва ў галіне якасных паказальнікаў (якасьць прадукцыі, зьніжэньне сабекошту і г. д.), а таксама за больш поўнае і рацыянальнае скарыстаньне прыродных багацьцяў БССР на службу сацыялістычнаму будаўніцтву. Актыў заклікае арганізацыю напружыць усе сілы, каб вырашыць гэтыя важнейшыя задачы ў галіне прамысловага будаўніцтва, якія перад партыяй паставіў 13-ы зьезд КП(б)Б, шырока разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

7. 13-ы зьезд ва ўсю шырыню паставіў перад партыяй задачы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і разгортваньня сельска-гаспадарчай прадукцыі. Канстатуючы вялізарнейшыя дасягненьні ў адносінах пасьпяховага правядзеньня па ўсім Савецкім Саюзе пасеўнай кампаніі, актыў разам з тым адзначае значнае адставаньне БССР (выкананьне пасеўнага пляну дасягнула ўсяго 90,3 проц., па ільне—74,1 проц.). Актыў заклікае ўсю Менскую арганізацыю стаць у галіне пасьпяховага завяршэньня бальшавіцкай пасеўнай кампаніі прыкладам для ўсёй БССР, падцягваючы сваім прыкладам адсталыя акругі.

Актыў падкрэсьлівае асаблівую важнасьць гэтай задачы ў сувязі з тым, што перад намі стаіць неабходнасьць не расеву значнага процанту засеянай плошчы ў сувязі з замаразкамі.

Да 13-га зьезду КП(б)Б на Менскай акрузе ёсьць 14,9 проц. абагуленых гаспадарак і 24,5 проц. зямлі пад калгасамі. Наша задача заключаецца ў тым, каб рашуча перамогны перагібы, выправіць там, дзе шляхам перагібаў была створана пагроза парушэньня адносін з серадняком так, каб серадняк цалкам і поўнасьцю наблізіўся да нас. Мы павінны ўзмацніць дапамогу таварышом, якія працуюць у вёсцы, сельскім ячэйкам, сельсаветам. Мы павінны на базе суровага захаваньня прынцыпу добраахвотнасьці калгаснага руху дабіцца таго, каб увосень гэтага году падвоіць колькасьць калгаснікаў, ажыцьцёвіўшы лёзунг: уся партыйная арганізацыя па дапамогу ў справе вярбоўкі ў калгасы кожным калгасьнікам ня менш аднаго індывідуальніка—бедняка і серадняка.

Актыў заклікае ўсю арганізацыю выкананць дырэктыву зьезду: у барацьбе супроць праваапартуністычных тэорый «самацёку ў калгасным руху», супроць «левых» апартуністычных крыкаў аб адступленьні, замацаваўшы калгасы настойліва падрыхтаваць умовы для разгортваньня масавай калектывізацыі ў суцэльную і, апіраючыся на беднату і калгасьнікаў, узмацніўшы саюз з серадняком, яшчэ больш цьвёрда і рашуча наступаць на кулака, каб ліквідаваць кулацтва, як клясу, на базе суцэльнай калектывізацыі.

8. Актыў Менскай арганізацыі канстатуе паляпшэньне матар'яльнага становішча рабочае клясы і неабходнасьць дабівацца далейшага паляпшэньня гэтага становішча, разам з тым адзначае рад труднасьцей, якія за апошні час выявіліся ў справе рабочага забесьпячэньня. Актыў падкрэсьлівае, што ў пытаньнях рабочага забесьпячэньня рашаючае значэньне мае рабочая каапэрацыя, а таксама разгортаньне каапэрацыяй і прафсаюзнымі арганізацыямі калектыўнай самадзейнасьці рабочых, асабліва ў галіне агародніцтва, дробнай жывёлагадоўлі (сьвіньні, трусы і г. д.).

9. Як баявое заданьне для Менскай партыйнай арганізацыі, актыў лічыць падрыхтоўку сіл для хуткага правядзеньня ўборачнай кампаніі, а таксама для падрыхтоўкі асеньняй пасеўнай кампаніі.

10. Актыў падкрэсьлівае правільнасьць тэй рэзкай крытыкі, якую зьезд праявіў у ацэнцы работы партыйных арганізацый па кіраўніцтве камсамольскімі арганізацыямі. Актыў лічыць, што Менская партыйная арганізацыя, як вядучая арганізацыя ў нашай партыі, павінна дапамагчы камсамольскай арганізацыі выканаць у самы кароткі тэрмін дырэктывы аб больш шырокім ахопе батрацкай, бядняцкай і калгаснай моладзі, а таксама аб арганізацыйным ахопе камсамолам усіх 100 проц. рабочай моладзі.

11. Актыў лічыць неабходным, у адпаведнасьці з дырэктывамі 13-га зьезду КП(б)Б, узмацніць работу сярод працоўных жанчын і нацыянальных меншасьцяй і так яе арганізаваць, каб гэта работа стала арганічнай часткай штодзённай работы ўсёй Менскай партыйнай арганізацыі і кожнай яе ячэйкі ў паасобку.

12. Заклікаючы ўсю арганізацыю павялічыць увагу да работы прафсаюзаў і да больш рашучага наваротy іх «тварам да вытворчасьці», актыў з асаблівай сілай падкрэсьлівае задачы Менскай арганізацыі ў справе выхаваньня новых рабочых.

13. Актыў завастрае ўвагу Менскай партарганізацыі на пытаньні падрыхтоўкі кадраў наогул і на падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы партыйных кадраў і асабліва нова-ўступаючага масавага пралетарскага папаўненьня ў рады партыі.

14. Далейшае нераможнае сацыялістычнае наступленьне рабочае клясы, апіраючыся на беднату і калгасьнікаў і ідучы ў саюзе з серадняком, будзе выклікаць шалёнае супраціўленьне клясавага ворага і абвастрэньне на гэтай глебе клясавай барацьбы ў краіне. Актыў канстатуе, што гэта супраціўленьне зьяўляецца часткай тэй барацьбы, якую сусьветны капітал вядзе супроць рабочае клясы, абвостранае клясавае змаганьне ў нашай краіне зьяўляецца часткай сусьветнай клясавай барацьбы паміж працай і капіталам. Пераможнае разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, крызіс капіталістычнай гаспадаркі, які няўхільна наглыбляецца, рэвалюцыйныя падзеі ў калёніяльных і поўкалёніяльных краінах—разбураюць фундаменты сусьветнай капіталістычнай сыстэмы, штурхаючы сусьветных драпежнікаў на спробы знайсьці выхад з тэй катастрофы, якая іх пагражае, шляхам узброенага нападу на СССР і ператварэньня браніяваным ботам ачага сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі—Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту.

У ажыцьцяўленьні гэтых злачынных замыслаў не апошнюю ролю адыгрывае фашысцкая Польшча.

Менская арганізацыя КП(б)Б, якая непасрэдна знаходзіцца на рубяжы з сьветам капіталістычных драпежнікаў, павінна асабліва пільна адносіцца да пытаньняў узмацненьня абароназдольнасьці БССР і ўсяго Савецкага Саюзу.

15. Прадпасылкай вырашэньня тых вялізарных задач у галіне сацыялістычнага будаўніцтва, якія паставіў 13-ы зьезд партыі, зьяўляецца яшчэ большае ўзмацненьне сувязі партыйнай арганізацыі з рабочымі і працоўнымі масамі, узмацненьне ўцягваньня іх у сацыялістычнае будаўніцтва, далейшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, неаслабная барацьба з бюракратычнымі скажэньнямі і зьявамі разлажэньня ў паасобных зьвеньнях нашага апарату, далейшае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, ідэйнае і арганізацыйнае замацаваньне партыі і ўзмацненьне яе пралетарскай базы і пралетарскага касьцяка.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) баявы атрад Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў), як і раней, будзе цьвёрда і рашуча змагацца за наўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі.

Няхай жыве КП(б)В і яе Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве 16-ы зьезд УсеКП(б) і яе Ленінскі Цэнтральны Камітэт!

За актыўны ўдзел прафарганізацый у рабочым забесьпячэньні

Чацьверты пленум УсеЦСПС у сваёй пастанове падкрэсьліў выключна важнае значэньне актыўнага ўдзелу саюзных арганізацый у разгортваньні загатовак харчовых прадуктаў, у разгортваньні будаўніцтва прыгарадных гаспадарак, у забесьпячэньні пралетарскіх цэнтраў прадуктамі харчаваньня, у барацьбе за зьніжэньне раздробных цэн.

Пленум ЦСПСБ, які зараз адкрываецца павінен будзе ўлічыць гэтыя дырэктывы УсеЦСПС, завастрыць увагу органаў Нарыамгандлю, рабочай каапэрацыі і прафарганізацыі на пытаньні паляпшэньня рабочага забесьпячэньня.

Перабої ў рабочым забесьпячэньні зараз даюць сябе востра адчуваць. Асабліва складаная мясная праблема, якая патрабуе самай сур'ёзнай увагі савецкай грамадзкасьці.

На 1 чэрвеня загатоўкі мяса ў БССР выкананы толькі на 83,1 проц., ёсьць акругі, як Бабруйская і Мазырская, дзе выканана ад 73 да 75 проц., як Полацкая, якая выканала толькі 50,5 проц. пляну.

Пленуму трэба будзе вызначыць рад мерапрыемстваў, накіраваных на тое, каб мясазагатоўчы апарат мог поўнасьцю выканаць заданьне. Прафсаюзы на мясцох павінны дапамагчы загатоўчаму апарату справіцца са сваімі абавязкамі. Пры дапамозе рабочых брыгад трэба ўзмацніць загатоўчую работу, прасякнуць у глыбіню раёнаў, прыняць рад мер, каб скончыць з нерацыянальным разьмеркаваньнем мясапрадуктаў.

Калі мы вывучым пытаньне аб мабілізацыі мясцовых харчовых рэсурсаў, дык мы ўбачым, што і тут далёка ня ўсё стаіць добра. Плян адкорму сьвіней выкананы толькі на 62,4 проц. Плян арганізацыі прыгарадных гародніх гаспадарак выкананы толькі на 62 проц. Каапэрацыя слаба працуе на гэтым участку. Сродкі, якія асыгнаваны на арганізацыю прыгарадных гаспадарак далёка не скарыстоўваюцца поўнасьцю.

Прафсаюзы мала цікавяцца гэтай справай. Ёсьць факты, калі цэнтральныя праўленьні прафсаюзаў тармозяць выкананьне дырэктыў ЦСПСБ аб водпуску сродкаў на арганізацыю прыгарадных гаспадарак. ЦП будаўнікоў дало дырэктыву сваім акраддзяленьням не выдаваць на гэту справу сродкаў.

Пленум ЦСПСБ павінен падкрэсьліць неабходнасьць укладаньня 350.000 руб. у прыгарадныя гаспадаркі.

Прафсаюзы павінны дапамагчы рабочай каапэрацыі забясьпечыць прыгарадныя гаспадаркі спэцыялістымі, інвэнтаром з тым, каб шырока разгарнуць іх сетку.

Прафсаюзы павінны праверыць як каапэрацыя выконвае прапановы рабочых па агладзе рабочай каапэрацыі, паглядзець, што зроблена ў галіне зьніжэньня цэн. Неабходна для гэтай мэты скарыстаць рабочыя брыгады.

Прафарганізацыі, разам з рабочай каапэрацыяй, павінны прыступіць да рэалізацыі тых соцень прапаноў, якія былі высунуты ў часе агляду грамадзкага харчаваньня. Трэба дабіцца перапому ў галіне грамадзкага харчаваньня.

Пры мабілізацыі ўвагі рабочых мас мы зможам дабіцца значных посьпехаў у справе рабочага забесьпячэньня.

З. МЭРЫНГОФ.

Аршаншчына перавыканала леташні плян на 4 проц.

У радзе акруг разгарнулася праверка выкананьня пасеўных плянаў. На 15 чэрвеня Аршанская акруга перавыканала леташні плян веснавой сяўбы на 4 проц., пашырыўшы пасеўную плошчу прыблізна на 10.000 гэкт.

Мазырская і Магілеўская акругі перавыканалі леташні плян на 1,5 проц.

Аршанская акруга ідзе наперадзе па сяўбе ільну. На 15 чэрвеня яна дала 86,5 проц. заданьня, засеяўшы, такім чынам, леташнюю плошчу ільну.

АБВЕШЧАНЫ СТАН АБЛОГІ

ВЕНА. Як падаюць з Бухарэста, забастоўка рабочых машынабудаўнічых заводаў у Рэшыцы (Румынія), абвешчаная 3 чэрвеня, прыняла абвостраную форму, у сувязі з чым у раёне забастоўкі абвешчаны стан аблогі. Заводы і суседнія вуліцы былі заняты войскамі. Каля заводаў былі расстаўлены кулямёты. З прычыны крайняга ўзьняцьця рабочых і няўпікальнасьці крывавых сутычак улады адазвалі войскі. Дэлегацыя рабочых скончыла ў Бухарэсьце перагаворы з міністэрствам працы аб спыненьні забастоўкі пры ўмове звароту на работу ўсіх баставаўшых. (ТАСС).

ПРАВАКАЦЫЙНАЯ КАМЭДЫЯ АНТЫСАВЕЦКІХ АЎТАРАЎ

ПРАГА. У доўгіх апісаньнях забойства і аграбленьня праскага ювэліра і лоўлі яго забойцы — рускага белаэмігранта Валовіка газэты, нібы, са слоў забойцы паведамляюць, быццам, ён зьяўляўся савецкім кур'ерам паміж Парыжам і Прагай і, нібы, начаваў у праскім поўпрэдзьве. (ТАСС).

У ЗНАК ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ АНТЫСАВЕЦКАЙ КАМПАНІІ

ВЕНА. Герналься (раён Вены) на масавым мітынгу мясцовай арганізацыі Аўстрыйскай кампартыі для пратэсту супроць антысавецкай кампаніі II-га Інтэрнацыяналу 17 рабочых і работніц, якія належалі на працягу многіх год да сацыял-дэмакратычнай партыі, заявілі аб уступленьні ў рады камуністычнай партыі.

Швэдзкая буржуазія на падтрыманьні фінскага фашызму

СТАКГОЛЬМ, 18. Швэдзкая буржуазная і сацыял-фашысцкая прэса, якія ўважліва сочаць за падзеямі ў Фінляндыі, адшудпны ў адэнцы фашысцкага характару апошніх выступленьняў прамыслоўцаў і буйных зямляўласьнікаў. Кансэрватыўная прэса салідарызуецца з фінскімі фашыстымі, асабліва падкрэсьліваючы «неабходнасьць поўнага выкараненьня камунізму ў Фінляндыі, як у пагранічным з СССР краі». Частка гэтае прэсы аддае перавагу легальнаму фашызму перад фашысцкім пераваротам.

Лібэральная прэса выказваецца за «барацьбу з камунізмам у рамках законнасьці».

С-д. прэса, выступаючы фармальна супроць фашызму, падкрэсьлівае свае паслугі ў барацьбе з камунізмам ў Фінляндыі.

Рабочая «Арбэйтэрэн» заклікае да рашучай барацьбы ў абарону клясавых

Два гіганты сацыялізму ўступілі у строй

Пралетарыят адзначае дзьве новыя вялізарнейшыя перамогі на фронце індустрыялізацыі краю, на фронце сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі. Уступілі ў бой два сусьветныя гіганты — Сталінградзкі трактарны завод і Растоўскі завод с.-г. машын.

* * *

У галодным 1919 годзе, на VIII зьезьдзе партыі, гаворыць Ленін:

— Калі-б мы маглі даць заўтра 100 тысяч першаклясных трактараў, забясьпечыць іх бензынаю, забясьпечыць іх машыністымі (вы дасканала ведаеце, што пакуль гэта — фантазія), дык сярэдні селянін сказаў-бы: «Я — за камунію».

У 1925 годзе Дзяржынскі падымае пытаньне аб пабудове ў СССР трактарнага заводу. Але краіна яшчэ не апраўлялася, краіна яшчэ не настолькі багата, каб даць будаўніцтву мільёны руб.

У 1926 годзе Галоўмэталь атрымлівае загад пачаць падрыхтоўчыя работы да пабудовы трактарнага заводу. На той-жа Галоўмэталь ускладзена задача выбраць тып трактара, які павінен будзе выраблядца на першым савецкім заводзе.

1927 г. Вялізарная пустка над Сталінградам, якая мяжуецца з астраханскімі стэпамі, абрана для пабудовы трактарнага заводу. Сталінград багаты добрымі воднымі і чыгуначнымі шляхамі зносін. Трактары з заводу пойдуць галоўным чынам на паволскія палі і палі Паўночнага Каўказу.

У тым-жа годзе асобая ўрадавая камісія рашыла, што завод будзе выпускаць трактары сыстэмы «інтэрнацыянал». Гэты трактар эканомна выдаткуе гаручае. Магутнасьць яго дастаткова, каб задаволіць патрабаваньням паўночна - каўказкіх і паволскіх палёў.

— Дзесяць тысяч трактараў у год, магутнасьцю ў 10-20 конскіх сіл кожны —вось заданьне СПА. Заданьне дадзена ў чэрвені 1927 году, але ўжо ў красавіку 1928 году СПА прымушаны зьмяніць сваё першапачатковае меркаваньне і павялічыць гадавы выпуск заводу да 20.000 трактараў. У сьнежні 1928 году паводле трэцяга варыянту завод атрымоўвае заданьне на 50.000 трактараў, магутнасьцю ў 15-30 конскіх сіл.

На вялізарнай плошчы ў 540 гэктараў пачынаюцца вышукальныя работы, пачынаецца пабудова жыльлёвых памяшканьняў для сэзоньнікаў. У ліпені 1929 году скончаны чарнявы на будынак асноўных цэхаў. Падыходзіць пакрысе будаўнічы матар'ял. Восень. І вось пачынаецца ўдарная работа па пабудове цэхаў.

Ужо вядомы абрысы будучага волата. Вытворчасьць трактараў будзе сканцэнтравана ў трох вялікіх цэхах — кавальскім, ліцейным і мэханічна - зборачным. Гэтыя цэхі былі пабудаваны такімі тэмпамі, што нават галава амэрыканскай будаўнічай фірмы — Альбэрт Кан — павінен быў заявіць:

—Рабочыя і інжынэры Сталінграду паказваюць такія дасягненьні, якія ні ў якім разе ня змогуць быць дасягнуты ў нашай краіне.

Аб вялізарнасьці заводзкіх цэхаў можна меркаваць па такіх лічбах.

Мэханічна - зборачны цэх размешчаны на 5-ці гэктарах зямлі. Ён будзе выраблядь 1.900 дэталяй для трактараў. Тут будуць працаваць каля 900 варштатаў і зьвыш 5000 рабочых, кавальскі і ліцейны цэхі будуць даваць 700 трактарных дэталяй.

Ва ўсіх гэтых цэхах работа будзе адбывацца адзінымі патокам. Кожны варштат будзе выраблядь раз на заўсёды заданыя яму дэталі. Затым усе яны пойдуць для зборкі на агульны канвэйер.

Акрамя гэтых трох гігантаў - цэхаў, завод распадаецца на некалькі буйных дапаможных:

Інструмантальны, рамонтна - мэханічны; тэрмічныя майстэрні; сілавая станцыя.

Усяго на заводзе будзе працаваць 10.500 рабочых, інжынэраў, тэхнікаў і служачых. З іх — 300 амэрыканцаў.



На аўтазборачным заводзе ў Ніжнім-Ноўгарадзе пасьля незначнага перапынку з-за недастаўкі грузаў з Амэрыкі з 5-га чэрвеня канвэер заводу зноў пушчаны ў ход. Замест звычайных 20 машын, зараз штодня зьбіраецца 24 машыны. На здымку: гатовыя пасьля збор кі машыны.

Амэрыканскія фірмы для зборкі, клёпак і ўстаноўкі канструкцый мэханічна - зборачнага цэху назначылі 163 дні. Усе гэтыя работы, на зьдзіўленьне амэрыканцам, удалося выканаць у 28 дзён.

Кавальскі цэх быў пабудаваны ня ў 170 дзён, а ў 45 дзён.

Ударнаму будаўніцтву ішлі на дапамогу калгасьнікі, рабочыя Сталінграду і іншых прамысловых цэнтраў.

Калі паўночна - каўкаскія станічнікі даведаліся, што заводу не хапае жвіру, яны наладзілі нядзельнік. У выніку некалькі цягнікоў са жвірам прышлі на будаўніцтва бясплатна. Камсамольцы, хатнія гаспадыні, рабочыя калёнамі прыходзілі на пабудову і суботнікамі дапамагалі ўздымаць трактарны волат ніцігодкі.

Людзі працавалі ня лічачыся з часам і надвор'ем. У пургу, у дождж, у сьнежныя мяцельныя дні. Шырока было разьвіта сацыялістычнае спаборніцтва і рух ударных брыгад. І да сьнежня асноўныя цэхі былі падведзены пад дах.

Амэрыканскія фірмы не пасьпявалі за такімі тэмпамі. Абсталяваньне з Амэрыкі спазьнілася ча некалькі месяцаў. Мантажнікі не заміналіся. Да грузчыкаў Новарасійску яны паслалі свае брыгады. Аб'яднаныя брыгады грузчыкаў і трактарабудаўнікоў разгружалі амэрыканскія нараходы і пасылалі машыны спэцыяльнымі маршрутамі на трактарную. 24 мая пачалі прыходзіць нараходы з абсталяваньнем у Новарасійск. 1 ўжо да 3 чэрвеня сотні варштатаў сталі на сваіх мясцох у цэху.

Ударная работа дазволіла ісьці побач з надзвычайнымі тэмпамі. Завод быў пушчаны раней тэрміну.

Быў такі час, калі завод думалі пусьціць толькі да кастрычніка 31 году з тым, каб ён даў у гэтым годзе 75 трактараў, у наступным — 1100 трактараў і толькі ў канцы 1934 году меркавалася давесьці выпуск да 40 тысяч трактараў у год.

Пляны перакрэсьлены крыж-на крыж. Завод пушчан 17-га чэрвеня 1930 году —на год раней тэрміну. У гэтым-жа — 1930 годзе — ён дасьць краю 25.000 трактараў, а з будучага году бязупынна будуць выходзіць з варот 50.000 трактараў у год. Што для гэтага патрэбна? Для гэтага патрэбна, каб праз кожныя 5 з паловай хвілін выходзіў з канвэйера гатовы, сабраны жывы трактар.

Сталінградзкаму трактарнаму заводу патрэбны ня толькі чыгун, жалеза, сталь і машыны — яму патрэбны людзі. У лістападзе мінулага году ЦК камсамолу правёў мабілізацыю некалькіх тысяч камсамольцаў на трактарны гігант. Зараз гэтыя камсамольцы ўжо стаяць ля варштатаў. Першыя трактары будуць зроблены іх рукамі.

Сталінградзкі трактарны завод — толькі першанец савецкага сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва. У хуткім часе будзе пушчаны ў ход трактарны завод з такой-жа вытворчасьцю—Харкаўскі. Ужо гатоў і пачаў працаваць вялізарны трактарны цэх на Путыліўскім заводзе. І, нарэшце, закладзен завод у Чалябінску, які будзе выпускаць 50.000 вуснічных трактараў, магутнасьцю ў 50 конскіх сіл кожны.

* * *

Скончылася будаўніцтва Растоўскага заводу с.-г. машын. Апошнія пабудаваныя цэхі вызваляюцца ад рыштаваньняў.

— Выпушчана першая партыя — 24 радавыя і 50 дысканых сэялак.

— Выпушчаныя тры месяцы таму назад першыя 300 трактарных зьнопавазлак, якія на работе далі здавальняючыя вынікі...

Сельмашстрой зьяўляецца адным з найбольшых заводаў у сьвеце.

Сельмашстрой выкоўвае машыны для сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі. Тэрыторыя заводу займае 117 гэктараў. Ужо пабудавана 35 карпусоў з агульнай плошчай звыш мільёна куба-мэтраў.

Кавальска-прэсавы цэх займае месца нячуванае, нават, у Амэрыцы—з плошчай у 3 гэкт., з прадукцыйнасьцю 165 тыс. тон у год.

На будаўніцтве Сельмашзаводу выкарыстана 50.000 вагонаў будаўнічых матар'ялаў, выдаткавана 3½ тыс. куба-мэтраў бэтону, 27 млн. цэгелы, 3.500 тон жалезных канструкцый.

Праграма гадовай прадукцыйнасьці разьлічана на 115 млн. руб. (супроць 37 млн. першага праекту).

Сусьветны гігант будзе выпускаць: **100.000 сялянскіх хадоў, 100.000 конных грабель, 100 тыс. трактарных плугоў, 100 тыс. снопавязалак, 30.000 сэяралак, 30.000 насалак, 10.000 барон, 10 тыс. трактарных прычэпак.**

Завод ахапляе 3.589 варштатаў і 9.256 рабочых пры варштатах, апрача іншых рабочых.

Заводзкія шляхі займаюць 19,5 кілёмэтраў.

Матар'ялу на выпрацоўку патрабуецца 30.400 вагонаў у год, 90 вагонаў у суткі.

Уся гэтая грандыёзная сталёвая маса выйдзе праз адны магутныя заводзкія вароты і будзе рухацца ў адным напрамку і пройдзе праз другія вароты — ужо **гатовымі машынамі, штодзенна сотнямі** вагонаў.

У кожную гадзіну — 171 гатовыя машыны.

Нячуваныя гэраічныя лічбы, якія могуць быць толькі ў краі нераможнага сацыялізму.

Гэта лічбы, якія паказваюць правільнасьць генэральнай лініі партыі, лічбы, якія б'юць па ўсіх тых, хто хістаецца ўправа, ці «ўлева» ад генэральнай лініі партыі. Гэта лічбы, якія б'юць па сусьветным капіталізьме.

К. П.

Вопыт „грамадзкага буксіру" перанясем на фабрыкі і заводы Беларусі

Лепшыя ўдарныя брыгады, перадавыя цэхі, лепшыя заводы на дапамогу адстаючым

З адозвы прэзыдыуму УсеЦСПС да ўсіх рабочых і саюзных арганізацый:

«Прэзыдыум УсеЦСПС надае выключнае значэньне практыцы арганізацыі «грамадзкага буксіру» **шахтай імя Арцёма** (Шахцінскага акруга). Рабочыя гэтай шахты, якія пасьпяхова выконваюць сваю вытворчую праграму, пастанавілі ўзяць «на грамадзкі буксір» шахту **«Кастрычніцкай Рэвалюцыі»**, якая вядзе з імі спаборніцтва і мае сур'ёзныя прарывы ў выкананьні пляну.

Рабочымі шахты імя Арцёма быў абраны «грамадзкі буксір» у складзе гаспадарніка, прафработніка, інжынэра і двух лепшых ударнікаў, якім было дана баявое заданьне: перадаць рабочым шахты **«Кастрычніцкай Рэвалюцыі»** практыку барацьбы за прамфінплян і дабіцца ва што-б ні стала лік відацыі гаспадарчых прарываў.

У арганізацыі «грамадзкага буксіру» шахты імя Арцёма і інш. прадпрыемстваў («Серп і Молат», элек трозавод і інш.) навочна дэманструюць прынцыпы спаборніцтва, іх карэнную адзнаку ад канкурэнцыі.

«Грамадзкі буксір», забясьпечваючы абмен практыкаю, азначае ўздым спаборніцтва на новым шляху. «Грамадзкі буксір» азначае ўздым на нязмерную вышыню пачуцьця адказнасьці кожнага пралетара за справу сацыялістычнага будаўніцтва.

«Я хопячы а гэтага, прэзыдыум **«грамадзкага буксіру» зрабіць уласнасьцю усіх фабрык і заводаў.** Адстаючыя брыгады, шахты, заводы, якія ня выконваюць пляну, павінны быць узятыя на «грамадзкі буксір». **Лепшыя ўдарныя брыгады павінны пайсьці да адстаюч

Ударым па „левых“ загібах у яўрабоце

Я. Пайкін.

«Асаблівасць перажываннага моманту, што змагаецца ў тым, што «левых» загібшчыкаў зьяўляецца ў нелівай форме змаганьня з правым апартунізмам». (Сталін).

Разгорнутае змаганьне ў ухілам ад генэральнай партыйнай лініі і разьвіцьцё самакрытыкі ў галіне яўработы, пачалося ў нас, як гэта вядома, з таго моманту, калі партыя, пачаўшы кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, выкрыла ўхілы ў яўрабоце, якія праявіўся ў Сампрамкаапэрацыі і ў галіне прамаслоўлення, ці ўнялі ўпарадкаваньні ў гэтых культбудаўніцтва. Яшчэ ў ліпені 1929 г. ЦК КП(б)Б, заслухаўшы даклад аб гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак, павінен быў адзначыць, «што ў гасдарчым упарадкаваньні мястэчак сказалася каса-сявая лінія ў практычнай работе ў тым сэнсе, што беднакам не ўпарадкавалася ў першую чаргу, а ўпарадкаваліся заможныя і капіталістычныя элемэнты». Пастанова ЦК таму прапануе «акруговам і акрывам ашкомам рашуча спыніць направільную ва ўпарадкаваньні мястэчак, абавязкова ўпарадкаваць у першую чаргу бяднейшае насельніцтва мястэчак, рашуча праводзячы такую лінію, якая выключала б магчымасьць ўпарадкаваньня заможна-капіталістычных элемэнтаў». Трэба адзначыць, што ў гэтай-жа пастанове ёсьць указанне папярэджаньне ад «левых» загібаў у галіне ўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных і беднаты. У 4-м пункце цытаванае пастановы гаворыцца: «даручыць фракцыі прэзыдыуму ЦВК паскорыць выкананьне пастановы Бюро ЦК аб праверцы палабуленых выбарчых праў з местачковага насельніцтва і далажыць бюро ЦК». Гэтым іменна была падкрэслена неабходнасьць дыферэнцыраванага падыходу да паўпраўленьня з местачковай беднатой.

На верасьнёўскім пленуме ЦК КП(б)Б абгаворвалася пытаньне аб Сампрамкаапэрацыі і была ўхвалена адпаведная рэзалюцыя, фіксуючая ўвагу партыі на месцы месца праявы ўхіл у гэтай рабоце. А ў сьнежні 1929 г. т. Бэйлін, былы сакратар яўбюро, пісаў у сваёй заяве, адрасаванай бюро ЦК КП(б)Б, наступнае:

1. Па перыяд майго прабываньня на чале яўбюро ЦК КП(б)Б і майго кіраўніцтва яўработай мною была праяўлена памылка, якая выражалася ў тым, што у справе гаспадарчага ўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных установа была ўзята на ўсё яўрэйскае насельніцтва, якое выяўляецца сацыялістычным сэктарам гаспадаркі, што і прывяло да права-апартуністычнай лініі ў рабоце і да змаганьня клясавай лініі. Гэта установка прывяла да правага ўхілу ў практычнай рабоце Сампрамкаапэрацыі і ў галіне упарадкаваньня на зямлі яўрэйскіх працоўных (засьмечанасьць капіталістычнымі элемэнтамі арцеляй Сампрамкаапэрацыі і калгасаў, скажэньне клясавай лініі ў гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак, скажэньне клясавай лініі пры прыёме на курсы кваліфікацыі).

Натэгарычна асуджаю гэтыя памылкі ў рабоце, асуджаю даную Яўбюро установку на ўцягваньне ў сампрамкаапэрацыю бядняцкіх і былых людзей, скарыстоўваючы іх ініцыятыву і капітал, асуджаю таксама сваё выступленьне з аналягічнай установкай на ўсебеларускім зьезьдзе Азет.

2. Лічу неабходным таксама заявіць, што маё выступленьне ў сьнежні мінулага году на прэзыдыуме Савету Нацыянальнасьцей па дакладу Саюзнага Камэту, якое (выступленьне) мною абгаворвалася на пасяджэньні Бюро ЦК ад 25 студзеня 1929 г., мае **недаацэнку тых вялізарных магчымасьцей нашага сацыялістычнага росту, якія вырашаюць таксама пытаньне ва ўпарадкаваньні яўрэйскіх працоўных мас.**

3. **У газэце «Змэс» за апошні час гаварылася аб тым, што работнікамі Беларусі быццам абаранялася тэорыя аб недапушчальнасьці дэяўрэізацыі БССР.** Гэтыя словы адносяцца да мяне. Маё выступленьне на пленуме ЦП Азету ў мінулым годзе з заявай аб тым, што трэба з узмацненьнем сродкаў на перасяленцкую работу неабходна ўзмацніць саюзныя сродкі на работу па гаспадарчым упарадкаваньні яўрэйскіх працоўных у БССР, выступаючы ў даным выпадку супроць лініі работнікаў саюзнага Камэту прапанаваўшых не адпускаць сродкаў на работу ў БССР, **мною было ўжыта наўдапас выражэньне «дэяўрэізацыя БССР», якое зьяўляецца памылковым.**

У гэтай заяве заінт-эсэнцыя правага ўхілу і яўрэйскага нацыянал-апартунізму:

а) адмаўленьне клясавага змаганьня і арыентацыя на «яўрэйскае насельніцтва» з капіталістычных элемэнтаў укупе, б) недаацэнка сацбудаўніцтва, нягледзячы ў магчымасьць нашай рэвалюцыі і в) тэорыя «захаваньня яўрэйскай нацыі» і не ўдзельнае вагі ў БССР — шавіністычнае разуменьне нацпраблемы.

Правыя ўхілістыя на лініі яўработы ставілі стаўку на «ўрастаньне кулака ў сацыялізм», узяли курс на «ініцыятыўнага» дзяльца, лічылі, што перад намі стаіць задача скажэньня ініцыятывы і капіталу яўрэйскага нэпманскага элемэнту. Пралетарска-клясавы зьмест ленінскай нацпалітыкі яны хацелі падмяніць нацыянал-апартуністычнай установкай на «адзіную яўрэйскую нацыю».

Разам з гэтым выявіўся і «левы» ухіл. Левыя фразэры пачалі тлумачыць пытаньне такім чынам, што, моў партыі наогул ня трэба весьці ніякай работы сярод яўрэйскіх працоўных, што партыі няма чаго клясіфікаваць аб яўрэйскай беднаце. Чутны былі галасы, што Азет і Камэт зусім лішнія арганізацыі і г. д. І г. д. Па сутнасьці сваёй гэта «левая» фраза прыкрывала правыя справы і служыла харчам для правага ўхілу.

Калі правыя ўхілістыя на бачылі перад сабой яўрэйскіх працоўных і беднаты і ніяк не маглі згадзіцца з тэй фармулёўкай партыі, што пры гаспадарчым упарадкаваньні яўрэйскіх трэба весьці на ўвазе працоўную беднату і разам з тэтым таксама беднату з былых нявытворчых пластоў насельніцтва; калі правыя ўхілістыя адсоль рабілі просты вывад аб неабходнасьці скарыстаньня ініцыятывы і капіталу нэпманскіх элемэнтаў, — дык «левыя» апартуністыя гаслі з тэй установкі, што няма, што няма каго гаспадарча ўпарадкаваць. Далей. Калі правых зьвуснай выходзіла фармулёўка, што трэба адмухнуцца ад перасяленчаскай работы, бо ня трэба «дэяўрэізаваць» БССР, дык «левыя» надкрэсьлівалі і выпукляли праблему перанасяленьня, як **выключны і адзін** сродак для вырашэньня пытаньня ў прыцягненьня да вытворчае працы яўрэйскага насельніцтва, махнуўшы, рукой на тыя магчымасьці, якія партыя мае на месцы, выходзячы з тэтым пытаньні з нацыянал-апартунізмам і г. д.

«Левыя» загібы і перахлёстваньні выявіліся асабліва і сувязі з тымі скажэньнямі, якія мелі ў рабоце на калгасным будаўніцтве, у часе «галовокружения от успехов». Тут «левы» загіб выявіўся як у практыцы інтэрнацыяналізацыі яўрэйскіх калгасаў, так і ў адносінах мястачковага насельніцтва.

У чым выявіліся гэтыя «левыя» загібы і скажэньні?

Цэлы рад матар'ялаў, выяўленых партыяй і апублікаваных у нашым друку, засьведчыць пераважнага заключаецца ў тым, што змаганьне з памылкамі «левых» загібшчыкаў зьяўляецца ў нелівай форме змаганьня з правым апартунізмам». (Сталін).

Разгорнутае змаганьне з ухіламі ад генэральнай лініі і разьвіцьцё самакрытыкі ў галіне яўработы, пачалося ў нас, як гэта вядома, з таго моманту, калі партыя, пачаўшы кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, выкрыла ўхілы ў яўрабоце, якія праявіўся ў Сампрамкаапэрацыі, ці ўнялі ўпарадкаваньні ў гэтых культбудаўніцтва. Яшчэ ў ліпені 1929 г. ЦК КП(б)Б, заслухаўшы даклад аб гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак, павінен быў адзначыць, «што ў гасдарчым упарадкаваньні мястэчак сказалася каса-сявая лінія ў практычнай работе ў тым сэнсе, што беднакам не ўпарадкавалася ў першую чаргу, а ўпарадкаваліся заможныя і капіталістычныя элемэнты». Пастанова ЦК таму прапануе «акруговам і акрывам ашкомам рашуча спыніць направільную ва ўпарадкаваньні мястэчак, абавязкова ўпарадкаваць у першую чаргу бяднейшае насельніцтва мястэчак, рашуча праводзячы такую лінію, якая выключала б магчымасьць ўпарадкаваньня заможна-капіталістычных элемэнтаў». Трэба адзначыць, што ў гэтай-жа пастанове ёсьць указанне папярэджаньне ад «левых» загібаў у галіне ўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных і беднаты. У 4-м пункце цытаванае пастановы гаворыцца: «даручыць фракцыі прэзыдыуму ЦВК паскорыць выкананьне пастановы Бюро ЦК аб праверцы палабуленых выбарчых праў з местачковага насельніцтва і далажыць бюро ЦК». Гэтым іменна была падкрэслена неабходнасьць дыферэнцыраванага падыходу да палабуленых з местачковай беднатой.

На верасьнёўскім пленуме ЦК КП(б)Б абгаворвалася пытаньне аб Сампрамкаапэрацыі і была ўхвалена адпаведная рэзалюцыя, фіксуючая ўвагу партыі на месцы месца праявы ўхіл у гэтай рабоце. А ў сьнежні 1929 г. т. Бэйлін, былы сакратар яўбюро, пісаў у сваёй заяве, адрасаванай бюро ЦК КП(б)Б, наступнае:

1. Па перыяд майго прабываньня на чале яўбюро ЦК КП(б)Б і майго кіраўніцтва яўработай мною была праяўлена памылка, якая выражалася ў тым, што у справе гаспадарчага ўпарадкаваньня яўрэйскіх працоўных установа была ўзята на ўсё яўрэйскае насельніцтва, якое выяўляецца сацыялістычным сэктарам гаспадаркі, **што і прывяло да права-апартуністычнай лініі ў рабоце і да змаганьня клясавай лініі.** Гэта установка прывяла **да правага** ўхілу ў практычнай рабоце **Сампрамкаапэрацыі і ў галіне упарадкаваньня на зямлі яўрэйскіх працоўных** (засьмечанасьць капіталістычнымі элемэнтамі арцеляй Сампрамкаапэрацыі і калгасаў, скажэньне клясавай лініі ў гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак, скажэньне клясавай лініі пры прыёме на курсы кваліфікацыі).

Натэгарычна асуджаю гэтыя памылкі ў рабоце, асуджаю даную Яўбюро установку на ўцягваньне ў **сампрамкаапэрацыю бядняцкіх і былых людзей, скарыстоўваючы іх ініцыятыву і капітал, асуджаю таксама сваё выступленьне з аналягічнай установкай на ўсебеларускім зьезьдзе Азет.**

2. Лічу неабходным таксама заявіць, што маё выступленьне ў сьнежні мінулага году на прэзыдыуме Савету Нацыянальнасьцей па дакладу Саюзнага Камэту, якое (выступленьне) мною абгаворвалася на пасяджэньні Бюро ЦК ад 25 студзеня 1929 г., мае **недаацэнку тых вялізарных магчымасьцей нашага сацыялістычнага росту, якія вырашаюць таксама пытаньне ва ўпарадкаваньні яўрэйскіх працоўных мас.**

3. **У газэце «Змэс» за апошні час гаварылася аб тым, што работнікамі Беларусі быццам абаранялася тэорыя аб недапушчальнасьці дэяўрэізацыі БССР.** Гэтыя словы адносяцца да мяне. Маё выступленьне на пленуме ЦП Азету ў мінулым годзе з заявай аб тым, што трэба з узмацненьнем сродкаў на перасяленцкую работу неабходна ўзмацніць саюзныя сродкі на работу па гаспадарчым упарадкаваньні яўрэйскіх працоўных у БССР, выступаючы ў даным выпадку супроць лініі работнікаў саюзнага Камэту прапанаваўшых не адпускаць сродкаў на работу ў БССР, **мною было ўжыта наўдапас выражэньне «дэяўрэізацыя БССР», якое зьяўляецца памылковым.**

У гэтай заяве заінт-эсэнцыя правага ўхілу і яўрэйскага нацыянал-апартунізму:

а) адмаўленьне клясавага змаганьня і арыентацыя на «яўрэйскае насельніцтва» з капіталістычных элемэнтаў укупе, б) недаацэнка сацбудаўніцтва, нягледзячы ў магчымасьць нашай рэвалюцыі і в) тэорыя «захаваньня яўрэйскай нацыі» і не ўдзельнае вагі ў БССР — шавіністычнае разуменьне нацпраблемы.

Правыя ўхілістыя на лініі яўработы ставілі стаўку на «ўрастаньне кулака ў сацыялізм», узялі курс на «ініцыятыўнага» дзяльца, лічылі, што перад намі стаіць задача скажэньня ініцыятывы і капіталу яўрэйскага нэпманскага элемэнту. Пралетарска-клясавы зьмест ленінскай нацпалітыкі яны хацелі падмяніць нацыянал-апартуністычнай установкай на «адзіную яўрэйскую нацыю».

Разам з гэтым выявіўся і «левы» ухіл. Левыя фразэры пачалі тлумачыць пытаньне такім чынам, што, моў партыі наогул ня трэба весьці ніякай работы сярод яўрэйскіх працоўных, што партыі няма чаго клясіфікаваць аб яўрэйскай беднаце. Чутны былі галасы, што Азет і Камэт зусім лішнія арганізацыі і г. д. І г. д. Па сутнасьці сваёй гэта «левая» фраза прыкрывала правыя справы і служыла харчам для правага ўхілу.

Калі правыя ўхілістыя на бачылі перад сабой яўрэйскіх працоўных і беднаты і ніяк не маглі згадзіцца з тэй фармулёўкай партыі, што пры гаспадарчым упарадкаваньні яўрэйскіх трэба весьці на ўвазе працоўную беднату і разам з тэтым таксама беднату з былых нявытворчых пластоў насельніцтва; калі правыя ўхілістыя адсоль рабілі просты вывад аб неабходнасьці скарыстаньня ініцыятывы і капіталу нэпманскіх элемэнтаў, — дык «левыя» апартуністыя гаслі з тэй установкі, што няма, што няма каго гаспадарча ўпарадкаваць. Далей. Калі правых зьвуснай выходзіла фармулёўка, што трэба адмухнуцца ад перасяленчаскай работы, бо ня трэба «дэяўрэізаваць» БССР, дык «левыя» надкрэсьлівалі і выпукляли праблему перанасяленьня, як **выключны і адзін** сродак для вырашэньня пытаньня ў прыцягненьня да вытворчае працы яўрэйскага насельніцтва, махнуўшы, рукой на тыя магчымасьці, якія партыя мае на месцы, выходзячы з тэтым пытаньні з нацыянал-апартунізмам і г. д.

«Левыя» загібы і перахлёстваньні выявіліся асабліва і сувязі з тымі скажэньнямі, якія мелі ў рабоце на калгасным будаўніцтве, у часе «галовокружения от успехов». Тут «левы» загіб выявіўся як у практыцы інтэрнацыяналізацыі яўрэйскіх калгасаў, так і ў адносінах мястачковага насельніцтва.

У чым выявіліся гэтыя «левыя» загібы і скажэньні?

Цэлы рад матар'ялаў, выяўленых партыяй і апублікаваных у нашым друку, засьведчыць пераважнага

вага насельніцтва. Даволі адносна гэтага, падаць некалькі найбольш яркіх прыкладаў. Карэспандэнт з Койданава піша, што «ўся работа фінінспэктара была праведзена сапраўды бюракратычным чынам, бяз удзелу рабочых і местачковай беднаты, і ў рэзультаце дапушчаны былі пры ападатканьні рад грубых скажэньняў партыйнай лініі». А вось факты: «фінінспэктар увесь час лічыць, што ліквідацыя кулацтва, як клясы, бязумоўна, папырваецца на дробных гандляроў, а таксама і па саматужнікаў. У рэзультаце атрымалася, што былыя гандляры 2-га, а часткова і 1-га разраду былі ападаткаваны на 3-4 тысячы рублёў. Дробны мясьнік з самых бедных мясьнікоў м-ка ападаткаваны сумай у 28 тысяч руб. Палітычнае «тупоумие» фінінспэктара зайшло так далёка, што не дапусьцёўшы ніякіх апэляцый быў канфіскаваны за падаткі дом у беднага крамара». Гэта — што датычыць дробных гандляроў. А далей ужо карэспандэнт расказвае аб адносінах да саматужнікаў «Аднаго саматужніка-каваля, які ня мае наёмнай сілы і працуе адзін, фінінспэктар вылічыў, што ён зарабляе 300 руб. у месяц. Гэты выпадак усхваляваў усіх — ня можа быць, што каваль-адзіночка зарабляў такую суму — тады фінінспэктар знайшоў іншы сродак: ён уключыў у даход гэтага каваля 6 дрэваў, якія растуць ля яго дому, і такім чынам атрымаўся непрацоўны даход ад «саду». Гэты каваль з прычыны вялікага падатку павінен быў кінуць сваю майстэрню». Той-жа карэспандэнт расказвае аб тым, што ёсьць факты, калі «больш моцныя саматужнікі ападаткаваны менш за бедных саматужнікаў». Вось ужо сапраўды зрастаньне правага і «левага» ўхілу.

Падамо яшчэ некалькі фактаў з м. Любань. Карэспандэнт з гэтага мястэчка расказвае наступнае: «наша мястэчка захаладнае і таму многія адказныя работнікі ад «головокружения» зусім забылі аб дзяржаўных законах... Большасьць муніцыпалізаваных дамоў складаюцца з 50—60 кв. мэтраў. Кошт некаторых дамоў складае 700—800 рублёў, але камгасам яны ацэнены ў 5.000 руб. Муніцыпалізавалі дамы таксама ў рабочых і саматужнікаў. Забралі дом у будаўніка, члена прафсаюзу, Кавалерчыка, Грэйнома, які працуе сікераю ўсе свае гады. Забралі халупу ў члена швейнай арцелі т. Росіна, які ўвесь час існаваньня савецкай улады вядзе актыўную грамадзкую дзейнасьць, — забралі толькі на падставе таго, што яго халупка знаходзіцца паміж раду краю... Забралі таксама дом у шаўца-саматужніка Гольд бэрга, які пабудаваў яго ў 1925 г. Выселілі таксама саматужніцу-краўчыху, якая жыла ў свайго цесьця і ўсялілі туды саможнага, у якога ёсьць 4 каровы, сьвіньні і вялікая гаспадарка... Былога карабейніка Эпштэйна Ізраіля, 60-цігадовага старога, які ўжо больш году не займаецца сваёй справай, але жонка яго пячэ хлеб, ападаткавалі ў 1.500 руб., але ,па беднасьці, ён ня мог унесьці грошы, ён ледзь унёс 200 руб., а цяпер ён сядзіць у сынагозе і заліваецца сьлязьмі. **У сынагозе склалі падпісны ліст і зьбіраюць на яго карысьць ахвяраваньні...** 15 мая адбыўся суд над ім і яго засудзілі да зьняволеньня на паўтара гады».

Аб чым гаворадь гэтыя любаньскія факты? Яны гавораць аб «левых» загібах, **якія яўна ідуць поруч з правым ухілам, якія даюць харч клерыкальным элемэнтам,** а часамі находзяць на яўна контр-рэвалюцыйныя дзеяньні.

Вядомы факты, меўшыя месца ў Плешчаніцах, калі Плешчаніцкі РВК муніцыпалізаваў хаткі беднякоў, перааблікладзі вялікімі сумамі бедных саматужнікаў, *калі «злосных неплацельшчыкаў»* такога роду судзілі і арыштоўвалі, наладжваючы над імі аблавы «пад кіраўніцтвам» старшыні РВК Якубовіча, калі адабраныя рэчы ў неплацельшчыкаў зьбіраліся на складах, куды дапускаліся толькі жонкі адказных работнікаў... І правільна бюро Менакруткому КП(б)Б у сваёй рэзалюцыі па ніёках абсьледваньня фактаў скажэньня партлініі ў Плешчаніцкім раёне канстатавала, што «лёзунг партыі па ліквідацыі кулацтва, як клясы, яны мэханічна перанесьлі на местачковае насельніцтва і на саматужнікаў. Гэтыя памылкі паглыбляюцца яшчэ больш тым, што раённае парткіраўніцтва ранейшага складу і фракцыя РВК ведалі, што ЦК УсеКП(б) папярэдзіў, што лёзунг партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы ні ў якім выпадку ня можа быць пашыраны на местачковую дробную буржуазію, асабліва на саматужнікаў». Менакруткому ударыў па гэтых загібах. Але гэтыя, меўшыя месца, факты пацьвярджаюць аб пяноўнасьці раду «левых» загібаў у рабоце мястэчак. *)

Таксама мы маем рад перагібаў у галіне інтэрнацыяналізацыі яўрэйскіх калгасаў. Інтэрнацыяналізацыя яўрэйскіх калгасаў, узбуйненьне гэтых калгасаў, аб'яднаньне яўрэйскіх калгасьнікаў з бядняцка-серадняцкім элемэнтам—з з вакольных беларускіх сёлян, які нанава ўліўся, зьяўляецца адным з найбольш яскравых дакладаў нашай станоўчай работы па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных мас. Гэта лінія партыі на інтэрнацыяналізацыю павінна працягвацца і ў далейшым, выхоўваючы масы яўрэйскіх калгасьнікаў у інтэрнацыянальным духу. Але разам з тым кожнаму ясна, што гэта работа павінна ісьці ў адпаведнасьці з агульнымі дырэктывамі партыі аб добраахвотнасьці, аб выхаваньні мас і г. д. Мы на сёньняшні дзень ужо маем рад станоўчых рэзультатаў у гэтай галіне. Аб гэтым гавораць хаця-б лічбы па Гомельскай і Бабруйскай акругах: у Гомельскай акрузе ў калгасах у жніўні 1929 г. было 255 яўрэйскіх сем'яў, а 1930 г. ёсьць 573 сям'і, гэта—у сувязі з узбуйненьнем,

*) Трэба ў парадку самакрытыкі адзначыць, што газэта «Акцябр» дапусьціла палітычную памылку тым, што яна прапусьціла ў газэце фармулёўку аб «ліквідацыі кулацтва і гарадзкой буржуазіі, як клясы. Аб гэтым і аб іншых памылках «Акцябра» ў сувязі з калектывізацыяй я ў артыкуле да дня друку пісаў наступнае:

«Акцябр» ня ў час сыгналізаваў небясьпеку «левых» перагібаў у калгасным будаўніцтве. Удзяляючы шмат месца калгасному будаўніцтву, арганізуючы масы вакол генэральнай лініі партыі, змагаючыся з правым ухілам і з яго практычнымі праявамі, «Акцябр» несвоячасова пачаў змаганьне з «левымі» перагібамі ў калектывізацыі, бяручы правільны тон і зьмяшчаючы значны матар'ял з практыкі месц толькі тады, калі былі надрукаваны вядомыя артыкулы тав. Сталіна і адпаведныя дакументы ЦК УсеКП(б). Праводзячы правільна лінію па ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, друкуючы і папулярызуючы матар'ялы па пытаньнях аб арганізацыі і гаспадарчым будаўніцтве калгасаў, правільна ставячы пытаньне аб інтэрнацыяналізацыі яўрэйскіх калгасаў, ставячы разам з тым правільна нацiск на ўцягваньне яўрэйскай беднаты мястэчак у калгасы, **«Акцябр» некалькі раз даў няправільныя фармулёўкі аб ліквідацыі кулацтва і буржуазіі, як клясы, што магло садзейнічаць скрыўленьням, якія былі зроблены ў мястэчку** (раскулачваньне некаторых груп саматужнікаў і г. д.). Гэта памылка была выпраўлена «Акцябром» далейшым працягам барацьбы за ўмацаваньне калгасаў, зьмяшчэньнем матар'ялаў супроць «левых» перагібаў у калектывізацыі жыцьёў, у

інтэрнацыяналізацыяй і будаўніцтвам інтэрнацыянальных калгасаў. Такія-ж рэзультаты ёсьць і па Бабруйскай акрузе: у жніўні 1929 г. было 528 яўрэйскіх сем'яў калгасьнікаў, а на май 1930 г. маецца 998 яўр. сем'яў. Па 14-ці абсьледваных інтэрнацыяналізаваных калгасах **ёсьць павялічэньне колькасьці яўрэйскіх калгасьнікаў на 145 процантаў.** Гэтыя лічбы даводзяць правільнасьць лініі на інтэрнацыяналізацыю яўрэйскіх калгасьнікаў. Але і тут апартуністыя справа і «зьлева» імкнуліся сарваць лінію партыі. Так, напрыклад, мы, з аднаго боку, чулі ахі і ўздыхі наконт таго, што, моў, яўрэй-калгасьнік ня зможа ўжыцца разам з беларускім калгасьнікам, што, моў, з інтэрнацыяналізацыяй калгасаў адпадае пэрспэктыва росту яўрэйскіх калгасьнікаў. Яўрэйскі шавінізм, клерыкалізм і нацыянал-апартунізм хацелі скарыстаць гэту карту. З аднаго боку, «левыя» апартуністыя імкнуліся сарваць партыйную лінію мэтадамі адміністраваньня, прымусу, штучнага зьліву і г. д. У матар'ялах абсьледваньня тав. Гутмана, інструктара Белкалгасцэнтру, аб палажэньні узбуйненых яўрэйскіх калгасаў, мы чытаем:

«Факты выхадаў з гэтых (узбуйненых, інтэрнацыяналізаваных—Х. Д.) калгасаў гаворадь аб тым, што пры узбуйненьні існаваўшых яўрэйскіх калгасаў месці месца памылкі і перагібы, дапушчаныя на мясцох. Адзін з самых яскравых загібаў гэта тое, што пры зьліве і узбуйненьні гэтых калгасаў... у асобных мясцох гэта ўзбуйненьне прайшло без абмеркаваньня пытаньня на сходзе калгасьнікаў... Апрача таго, з-за маючай месца яшчэ да гэтага часу «гігантаманіі», назіраецца штучнае склейваньне асобных груп гаспадарак калгасьнікаў з розных населеных пунктаў у адзін калгас»... Гэтыя факты абек'тыўна льлюць ваду на млын правага апартунізму, бо гэта палітыка адміністраваньня непасрэдна вядзе да падрыву калгаснага будаўніцтва наогул.

Гэтыя факты з галіны местачковай праблемы і калгаснага будаўніцтва даволі пераканаўча гаворадь аб неабходнасьці жорсткай барацьбы з «левымі» загібамі, жывыча правы нацыянал-апартуністычны ўхіл. Але гэта яшчэ ня ўсё. Адно з галоўных выражэньняў «левага» ўхілу, які зьяўляецца на сутнасьці правым, крыецца ў тым, што дырэктывы партыі і савецкай улады аб дыферэнцыяваным падыходзе да «лішэнцаў» з яўрэйскай беднаты пры ўцягваньні іх у калгасы і сампрамкаапэрацыю дапускаючы гэту беднату, нават калі яна займалася дробным гандлём, калі толькі яна не зьяўляецца эксплёататарскай,—што гэта дырэктыва ва многіх выпадках на мясцох не рэалізуецца. Пасланая газэтай «Акцябрь» і Белкамзетам рабочая брыгада, у мэтах выяўленьня на месцы рэзультатаў выкананьня гэтай дырэктывы партыі, наткнулася на пасыўны сабатаж, у некаторых мясцох работнікі давалі адказы пакшталт наступных: «Мы ня можам дапускаць у калгасы якіх-бы там ні было «лішэнцаў», бо скажуць, што мы правыя ўхілістыя». Таяж брыгада выявіла рад выпадкаў, калі местачковая беднота бяз усякай падставы і наперакор дырэктывам партыі, залічваецца ў разрад «лішэнцаў» і гэтым аўтаматычна выкідаецца з саматужных арцеляй і калгасаў, або не дапускаецца туды. Вось факты. У м. Пятрыкове была пазбаўлена права голасу жанчына, страціўшая мужа-сталяра ў баёх з белапалякамі, толькі на тэй падставе, што яна некаторы час прадавала з латка. У м. Азарычах умудрыліся пазбавіць права *голасу беднака, які ж... з на утрыманьні* свайго зяця, на тэй падставе, што ён некаторы час меў першы разрад на прадмет продажу венікаў і крэйды. Жанчына-прачка, маючая двух сыноў-чырвонаармейцаў - калгасьнікаў, пазбаўлена права голасу на тэй падставе, што яе даўно памёршы муж быў мясьніком (паводле матар'ялаў рабочай брыгады газэты «Акцябр» і Белкамзему).

Мы, такім чынам, бачым, як некаторыя мясцовыя работнікі, жадаючы застрахаваць сябе ад правага ўхілу, дакаціліся да «левых» скажэньняў над. палітыкі партыі, тармозячы правядзеньне дырэктыў ЦК КП(б)Б у гэтай галіне.

І правыя і «левыя» ўхілістыя часта тлумачылі свой пасыўны апартунізм тым, што моў, партыя не дае дакладных указаньняў, што няма дакладнага дыферэнцыяваньня «каго можна» і «каго нельга» ўпарадкаваць. Між тым, дырэктыва партыі ясна гаворыць, што пры камплектаваньні калгасаў і саматужных арцеляй асноўная задача зьяўляецца ўцягваньне працоўнай беднаты: разам з тым дапусьціць да продукцыйнай працы (у калгасы і арцелі) тую частку беднаты, якая ня мае права голасу, не займалася продукцыйнай працай, але дробным гандлем, але якая не эксплёатавала чужое працы і ўжо не займаецца гандлем ня менш аднаго году. Дырэктыва ясная і гутарачкі аб недакладнасьці зьяўляюцца толькі прыкрыцьцём уласнага апартунізму. Гэта дырэктыва была дана яшчэ ў лістападзе 1929 г. Зараз ужо ёсьць рад пастаноў па савецкай лініі—ЦВК БССР і нац. камісіі пры ЦВК БССР—якія яшчэ больш удакладняюць гэта пытаньне.

Але ўхілістыя па сваім характары ня могуць успрымаць і пралямаць правільную парт. дырэктыву. Ім таму застаецца да чаго-небудзь прыдзірацца для таго, каб апраўдаць сваё ўласнае банкруцтва і замаскаваць сваю апартуністычную лінію. На гэтай дырэктыве таму яшчэ раз была выпрабавана прырода нашых правых і «левых» ухілістых, усялкага роду шавіністых і нацыянал-апартуністых у яўрабоце.

***

Паўстае запытаньне—ці ёсьць якалнебудзь розьніца паміж тымі «левымі» перагібамі, якія тут пералічаны, і правым апартунізмам? Па сваіх практычных рэзультатах яны зусім тоесныя, яны па сутнасьці сваёй антыпартыйны і працуюць абодва на карысьць клясавага ворага. «Левы» загіб тут проста жывіць правы ўхіл, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Трэба мець на ўвазе, што «левы» загіб зьяўляецца ня толькі непасрэдным «рэзэрвам» правага ўхілу. Манэўруючы і шукаючы выхаду, маскуючыся пад абарончы колер, правы ўхіл сваю работу хоча правесьці пад завесаю... змаганьня з «левымі» загібамі. Такога роду спробу мы мелі гэтымі днямі з боку аднаго азетаўскага работніка, калі ён у азетаўскай часопісі «Трыбуна» напрабаваў «пакрытыкаваць» КП(б)Б «зьлева», калі ён напрабаваў працягнуць думку аб неабходнасьці вербаваць рабочых з «лішэнцаў», прабуючы абвінаваціць «кіруючыя сфэры» БССР і газ. «Акцябр» у «левым» загібе на тэй падставе, што ў артыкуле, зьмешчаным у «Акцябры», ішла гутарка аб неабходнасьці «разгарнуць работу па ўцягненьні ў індустрыю перакваліфікацыі яўрэйскай беднаты і саматужнікаў, маючых выбарчыя правы». Тут мы маем праявы правага ўхілу пад маскай змаганьня з «левым» загібам.

Барацьба з «левымі» загібамі ў яўрэйскай рабоце, барацьба з ліквідатарска-нігілісцкімі адносінамі да гэтай работы і з «левай» фразай зьяўляецца непарыўнай часткай нашай барацьбы супроць правага ўхілу і нацыянал - апартунізму. «Левы» апартунізм жывіць правы ўхіл, правыя ўхілістыя падтрымліваюць «левых» апартуністых; «левыя» цікенька аплёдуюць правым, тое самае робяць апошнія; а разам яны працягваюць старую нацыянал-апартуністычную песеньку аб «выміраньні мястэчка», аб «пагібелі яўрэйства», разам яны глыбока спачуваюць усякай нашай няўдачы і рукаплясканць нацыянал - шавінізму. Трэба сказаць, што часта ў нас недаацэньваюць гэтага ўхілу, часта назіраецца самы яркі від прымірэнцтва ў адносінах да яўрэйскага нацыянал-шавінізму. Барацьба тут яшчэ толькі пачата.

Таму ў барацьбе супроць правага ўхілу і яўрэйскага нацыянал-апартунізму мы павінны даволі ўвагі аддаць яго пагутчыку «зьлева». Трэба мацней ударыць па пэсымістых і «плакальшчыках» у гэтым абсягу. Думаем, што дасягненьні КП(б)Б у галіне гаспадарчага ўпарадкаваньня і культурнага будаўніцтва сярод яўрэйскіх працоўных і беднаты, ня гледзячы на меўшыя месца прарывы і перагібы ў гэтай галіне, зьяўляюцца лепшым довадам правільнасьці партыйнае лініі. Лінія партыі заўсёды праявяецца на практыцы рэвалюцыйнай барацьбы. Таму мы з гэтай галіны падамо лічбы, якія характэрызуюць рэзультаты практыкі. Мы маем наступныя выпікі: па саматужнай каапэрацыі: на 1 красавіка 1930 г. было каапэравана 23.466 саматужнікаў, з іх: беларусаў 29,4 проц., яўрэяў—66,2 проц., расіянцаў —3,2% і г. д.; гэта маса каапэраваных саматужнікаў разьмяркоўвалася наступным чынам: у горадзе—40 проц., у мястэчку—32 проц., у вёсцы—27,7 проц. Ясна, што мы тут маем вялізарную масу каапэраваных яўрэяў саматужнікаў, і калі прыходзіцца зрабіць вывад з гэтых лічбаў, то ён скарэй за ўсё будзе заключацца ў тым, што неабходна палепшыць работу па ўцягваньні вясковай масы саматужнікаў і па павялічэньні долі вёскі паралельна з працягам работы па ўцягненьні, галоўным чынам, местачковых мас у сампрамкаапэрацыю. Мы вышэй падавалі ўжо лічбы аб росьце яўрэяў-калгасьнікаў. *) Таксама ідзе вялізарны рост колькасьці яўрэйскіх рабочых, якія складаюць зараз 36 проц. агульнага складу рабочых у БССР. Культурнае будаўніцтва сярод яўрэйскіх мас найбольш яскравым чынам характэрызуецца процантам пісьменнасьці: сярод яўрэйскага насельніцтва ёсьць 70 проц. пісьменных у той час, калі палякі даюць 50 проц., расіянцы 49 проц. і беларусы 36 проц. Узрастае колькасьць рознага роду сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, зьвеньні якіх прыстасаваны да абслугоўваньня мас, што гаворадь на яўрэйскай мове.

Зразумела, што ўсё гэта дасягнута ў выніку правільнай нацыянальнай палітыкі КП(б)Б. Усё гэта дасягнута іменна ў выніку таго, што КП(б)Б павяла рашучую барацьбу з усякімі ўхіламі ад ленінскай нацпалітыкі; усё гэта дасягнута ў барацьбе супроць яўрэйскага нацыянал-апартунізму як правага, так і «левага».

Гарантыяй далейшых посьпехаў у гэтым абсягу зьяўляецца—паглыбленая барацьба з новымі формамі гэтых ухілаў, якія паяўляюцца зараз. Змагаючыся з правым ухілам і з «левымі» загібамі, накіроўваючы агонь супроць нацыянал-дэмакратызму і беларускага нацыянал-шавінізму, партыя ні на адну мінуту не павінна аслабляць барацьбы з яўрэйскім нацыянал-шавінізмам, які ў сваёй антыпартыйнай дзейнасьці цалкам салідарны з беларускім і іншым нацыянал-шавінізмам і зьяўляецца агэнтурай кулака і пэпмана ў нашай партыі.

Х. ДУНЕЦ.

*) Агульная колькасьць яўрэяў-зямляробаў па Беларусі складае 9.100 с. (каля 50.000 душ) і займае каля 60.000 гэкт. зямлі. Апрача таго, з Беларусі 2.300 сем'яў перасялілася ў Крым і каля 500—

СЕНЬНЯ—ДЗЕНЬ ТРАКТАРА

Трактар—рухавік калектыўнага зямляробства, зброя барацьбы за выкарчоўваньне карэньняў капіталізму

ДАБ'ЕМСЯ 100% СКАРЫСТАНЬНЯ ТРАКТАРАЎ, ДАБ'ЕМСЯ ЎДАРНАЙ ІХ РАБОТЫ

Сталёвым коням—наша увага!

Трактар—гэта вымяральнік рэканструкцыі нашай сельскай гаспадаркі. Можна сказаць з упэўненасьцю, што чым больш процант трактараў у гаспадарцы, чым яна лепш, больш рацыянальна вядзецца. З трактарамі цесна зьвязаны пэрспэктывы шырокага ўздыму нашай сельскай гаспадаркі.

Мы зараз ужо ня можам сабе ўявіць больш-менш значнай савецкай або калектыўнай гаспадаркі без работы трактарных калён. Падамо толькі адзін прыклад, які яскрава малюе значэньне трактара для нашай сельскай гаспадаркі. Адзін саракасіловы трактар (вусепічны) пры рабоце адным семікорпусным плугам заарэ 10 гэкт. зямлі за 10 гадзін пры абслугоўваючым пэрсанале ў два чалавекі, а каб заараць пры дапамозе конскай цягавай сілы такую плошчу зямлі за гэты час, патрэбны 20 пар коняй і 20 чалавек.

Беларуская сельская гаспадарка пакуль яшчэ абслугоўваецца трактарамі ў нязначнай ступені. Усю ворную зямлю ў калгасах, якая займае плошчу ў 63.000 гэкт., абслугоўвае цягавая сіла ў 85.000 коняй і 350 трактараў,—як відаць, процант мэханізацыі апрацоўкі зямлі невялікі. У будучым годзе мяркуецца завезьці ў Беларусь 2.500 трактараў, акрамя 700 трактараў, якія будуць разьмеркаваны паміж 14 машынатрактарнымі станцыямі. Такім чынам, у будучым годзе ў нашых беларускіх калгасах мы ўжо будзем мець 20-25 проц. мэханізацыі апрацоўкі сельскай гаспадаркі.

Так што мы і ў Беларусі, раёне ня збожжавым, уступаем, у палясу буйной трактарнай гаспадаркі. Але гэта акалічнасьць кладзе на нас сур'ёзны і адказны абавязак—згуртаваньне ўвагі на вялікай трактарнай гаспадаркі.

У нашых беларускіх калгасах вельмі цепла, вельмі радасна сустракаюць кожны новы трактар, прыбыцьце новага трактара ператвараецца ў сьвята, ва ўрачыстасьць. Але вось прайшло сьвята, чэлі прамовы, і ў штодзённай работе мы трымаем трактар у чорным целе, мы, ня вывучыўшы яго асаблівасьцяй і дэталяй, б'ём яго і калечым—часамі, нават, пасьмерць.

Нізавыя зьвеньні сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў нас не зацікаўлены ў правільным і рацыянальным вядзеньні трактарнай гаспадаркі, трактарная справа ня вывучаецца, ёй не ўдзяляюць належнай ўвагі. Бадай, ня лепшыя адносіны да трактарнай гаспадаркі мы сустракаем у акруговых арганізацыях—зямельных і каапэрацыйных. А ў выніку ўсяго гэтага мы маем тое, што трактары часта нерацыянальна скарыстоўваюцца, што работа трактараў ня ўвязана з наяўнасьцю коннай цягавай сілы. Мы часта бачым, што трактарамі заворваюцца невялікія вучасткі, нават, агароды, а ў той-жа час коні стаяць без работы.

Тую невялікую колькасьць трактараў, якія ў нас ёсьць, мы павінны выкарыстоўваць з максымальнай эфэктыўнасьцю. Нам трэба кінуць трактары на апрацоўку найбольш цяжкіх вучастка—бросавых зямель, або зямель з цяжкай суглінюгай глебай.

Вялікі яшчэ процант паломак і іншага псаваньня трактара. Даведзена, што гэтыя паломкі машын на 90 проц. здараюцца ад невуцтва, ад няведаньня як абыходзіцца з трактарам і ад нядбайнасьці. Такія выпадкі, якія мелі месца ў Мар'інскім саўгасе (дзе трактар, якім кіраваў заснуўшы трактарыст, уваліўся ў абрыў і зламаўся), або ў Магілеўскай акрузе ў калгасе «Авангард» (дзе ў выніку неасьцярожнага абыходжаньня трактарыстага з бэнзынаю згарэлі два трактары) прымушаюць нас забіць трывогу.

Але тут мы натыкаемся на пытаньне аб кадрах для абслугоўваньня трактараў і трактарных калён—калёнаважатых, трактарыстых, мэханікаў. Гэтай вясной мы на трактарных семімесячных курсах выпусьцілі 350 чалавек. Але здарылася так, што ў зімовы час курсанты не навучаліся на практыцы трактарнай справе і калі яны прыехалі ў калгасы, дык ня ведалі, як сесьці за трактар і як ім кіраваць. Нам ужо зараз трэба прыступіць да падрыхтоўкі новых кадраў трактарыстых і мэханікаў, прычым гэтае навучаньне павінна праходзіць на практыцы, у трактарных калёнах.

Л. Няфедаў.



Трактарная калёна ў камуне імя БВА



Падвозка гаручага трактарам у саўгасе імя 10-годзьдзя БССР.

На барацьбу супроць псаваньня трактараў

Гутарка з нам. старшыні Белгалгасцэнтру тав. Стрэльле

Пасьняховае выкананьне плянаў службы і ўборкі ўраджаю ў значнай ступені залежыць ня толькі ад наяўнасьці, але і ад падрыхтаванасьці машын і асабліва трактараў. Трактар можа быць карысны калгасу толькі тады, калі ён утрымліваецца ў поўным парадку і рацыянальна выкарыстоўваецца.

Калгасныя органы павінны мабілізаваць думку шырокіх мас калгасьнікаў на барацьбу супроць псаваньня і паломак трактараў, супроць няправільнага выкарыстаньня іх, за беражлівыя і ўважлівыя адносіны да мэханічнай цягавай сілы.

«Дзень трактара» калгасьнікі павінны выявіць канкрэтных вінаватых у паломцы трактараў, канкрэтныя прычыны псаваньня мэханічнай цягавай сілы і прыняць рашучыя меры для зьнішчэньня іх. Лепшыя трактарыстыя, якія праявілі сябе ў часе веснавой службы, павінны быць прэміяваны як матар'яльна, так і пасылкай трактарыстых на рознага роду курсы і экскурсіі.

Неабходна прыняць меры для ўзмацненьня кваліфікацыі трактарыстых. Для гэтага павінны быць арганізаваны ў зімовы пэрыяд спэцыяльныя курсы.

«Дзень трактара» павінен быць праведзен пад лёзунгам бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, ня гледзячы на асобы. Над злоснымі вінаватымі псаваньня трактараў і машын трэба арганізаваць паказальныя агітсуды.

Што павінен даць „Дзень трактара"

(Гутарка з дырэктарам Белсельтрэсту т. Грэбенчыкам)

Ня гледзячы на значнае павялічэньне ў гэтым годзе колькасьці трактараў у саўгасах БССР, трэба сказаць, што процант мэханічнай цягавай сілы ў саўгасах пакуль што яшчэ невялікі. На сёньнешні дзень трактары складаюць 28,7 проц. агульнай цягавай сілы. Зразумела, што гэты процант зусім недастатковы для пабудовы сацыялістычнай мэханізаванай с.-г. фабрыкі.

Аднак, і да трактараў, якія ў нас ёсьць, у большасьці выпадкаў адносіны з боку саўгасаў вельмі дрэнныя. Трактары выкарыстоўваюцца зусім нерацыянальна. Амаль ва ўсіх саўгасах трактары працуюць са значнай недагрузкай Адносіны абслугоўваючага пэрсаналу да трактараў часта проста недапушчальныя. Часткова гэта тлумачыцца слабай падрыхтоўкай трактарыстых, якія скончылі кароткатэрміновыя трактарныя курсы. Асабліва гэта датычыць тых, якія прайшлі так званыя Васіпеўскіе трактарныя курсы. Выпускнікі кароткатэрміновых курсаў ня ведаюць мэханізму трактара і прыгодны толькі (і то не заўсёды) для кіраваньня трактарам.

Нормы апрацоўкі для кожнага трактара ў саўгасах не ўстаноўлены, нагрузка трактараў ня ўлічваецца. У сувязі з гэтым часта бывае, што кошт мэханічнай цягавай сілы абыходзіцца даражэй жывой цягавай сілы.

Вялікай перашкодай для нармальнага і поўнага выкарыстаньня трактараў зьяўляецца адсутнасьць дастатковай сеткі прыстасаваных рамонтных майстэрань, дзе трактары маглі-б свае часова і хутка рамантавацца.

«Дзень трактара» павінен пакласьці канец усім гэтым ненармальным зьявішчам.

Трэба ў першую чаргу дабіцца, каб трактарныя курсы былі даўжэйшыя і выпускалі больш кваліфікаваных трактарыстых, якія добра ведалі-б трактарны мэханізм.

У зімовы пэрыяд трэба арганізаваць курсы па перападрыхтоўцы трактарыстых.

На падставе практыкі буйных мэханізаваных гаспадарак (збожжатрэсту, цукартрэсту і інш.), трэба ўстанавіць максымальныя нормы нагрузкі трактараў як на палявых работах, так і на работах унутры гаспадаркі.

Неабходна арганізаваць сетку рамонтных майстэрань, наблізіўшы іх да месц знаходжаньня трактарных станцый і калён. Нарэшце, галоўнае, чаго трэба дабіцца — гэта сьвядомых і ўважлівых адносін да машын.

За культурнага трактарыстага

Гутарка з нам. наркамзема БССР т. Масюковым

Камуністычнай партыяй і савецкай уладай зараз аддаецца шмат увагі будаўніцтву прадпрыемстваў буйное прамысловасьці, якія вырабляюць сродкі вытворчасьці для сельскай гаспадаркі. Адным з такіх сродкаў вытворчасьці зьяўляецца трактар.

Да пачатку «Дня трактара» па абшарах БССР налічваецца каля 600 трактараў розных сыстэм і розных марак. На гэтых машынах працуе звыш 1.200 трактарыстых, якія выйшлі з асяродзішча батракоў, бедняко і серадняко - калгасьнікаў

Кантрольнымі пунктамі, зацьверджанымі ўрадам БССР, вызначаецца праграма завозу трактараў у наступным годзе да 5 тыс. штук. Ужо зараз НКЗем СССР прыняў плян завозу трактараў у БССР у колькасьці 2.600. Гэта патрабуе ўжо зараз зьвярнуць увагу на пытаньні правільнай арганізацыі трактарнай гаспадаркі і правільнай эксплёатацыі такой машыны, як трактар.

У «Дзень трактара» асноўны лёзунг, які трэба паставіць — гэта забесьпячэньне яшчэ ў большай ступені існуючымі машынамі тэмпаў калектывізацыі сельскай гаспадаркі, максымальнае паляпшэньне эксплёатацыі трактараў.

За правільнае выкарыстаньне трактараў! За сацыялістычнае спаборніцтва! За культурнага трактарыстага!

Дапамагчы сацыялістычнай рэканструкцыі с.-г.

Сёньня па ўсёй БССР праводзіцца «Дзень трактара». Гэты дзень мае мэтай праверыць, наколькі падрыхтаваны да работы трактары і іншыя сельска-гаспадарчыя машыны і ў якім становішчы яны знаходзяцца.

Задачы «Дня трактара»—МАБІЛІЗАВАЦЬ УВАГУ С.-Г. РАБОЧЫХ, КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ НА НЕАБХОДНАСЬЦЬ АШЧАДНЫХ, УВАЖЛІВЫХ АДНОСІН ДА ТРАКТАРАЎ, НА БАРАЦЬБУ З ПАЛОМКАМІ с.-г. машын, на барацьбу за ўзорнае хаваньне і ўтрыманьне трактараў.

Трэба выявіць канкрэтныя прычыны паломак і прастояў трактараў.

Трэба выявіць, чаму няпоўнасьцю скарыстоўваюцца трактары, што перашкаджае іх рацыянальнаму выкарыстаньню.

Трэба будзе стварыць атмасфэру грамадзкага ганьбаваньня вакол вінаватых у паломцы трактараў, прагульшчыкаў і тых, хто зрывае сацспаборніцтва на палёх.

Сотні мільёнаў рублёў выдаткуюцца на нашу трактарную гаспадарку. Ад рацыянальнага скарыстаньня трактарнай гаспадаркі, ад ашчадных адносін да трактараў залежыць эфэкт іх ужываньня на палёх. «Дзень трактара» павінен дапамагчы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, даць моцны штурмшок мэханізацыі сельска-гаспадарчай працы.

Трэба будзе прэміяваць лепшых трактарыстых, якія ў часе веснавой пасеўнай кампаніі дасягнулі найбольшых вынікаў у скарыстаньні трактараў, якія найлепш захоўваюць трактар і прылады да яго.

Задачы «Дня трактара» павінны быць вядомы кожнаму трактарыстаму, калгасьніку, бедняку і серадняку.



На здымку камбайны саўгасу «Гігант» прыведзены ў парадак і гатовы да ўборачнай кампаніі

IX пленум ЦСПСБ

18 чэрвеня адкрыўся чарговы IX пленум ЦСПСБ. На пленуме апрача членаў і кандыдатаў пленуму прысутнічаюць ударнікі, прадстаўнікі вытворчых нарад і старшыні заўкомаў буйнейшых прадпрыемстваў.

На першым пасяджэньні пленум заслухаў даклад тав. Грысевіча аб выніках выкананьня прамфінпляну і даклад тав. Аверына аб самаправерцы сацспаборніцтва.

Як выкананы прамфінплян

Вынікі нездавальняючыя

— Па валавой прадукцыі праграма за першае паўгодзьдзе г. г. выканана толькі на 92,5 проц., г. зн. 43 проц. гадавога заданьня — адзначыў у сваім дакладзе тав. Грысевіч.

— У сувязі з недавыкананьнем праграмы па валавой прадукцыі недабрана 8 міл. рублёў. Калі ўзяць абутковую прамысловасьць, дык яна недадала 152.000 пар абутку. Запалкавая прамысловасьць недадала за 7 месяцаў 28 тыс. скрынак запалак, бавоўнана-папяровая прамысловасьць не давырабіла звыш 800 тыс. мэтраў тканіны. Адначасова з гэтым ня выканана заданьне па зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

Па рэспубліканскай прамысловасьці зьніжэньне сабекошту прадукцыі вызначана ў 11 проц. За першае-ж паўгодзьдзе дасягнута зьніжэньне толькі на 7 проц., а за 7 месяцаў — 7,8 проц. (без Лесбелу). А калі ўзяць Лесбел, дык зьніжэньне будзе раўняцца толькі 6,5 проц. Такое зьніжэньне сабекошту прадукцыі нікудышнае. Дрэнна таксама абстаіць справа з якасьцю прадукцыі.

На гэты бок работы прамысловасьці трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу, каб дабіцца рашучага пералому ў выкананьні прамфінпляну.

— Калі за першае паўгодзьдзе 1928-1929 г. — кажа далей тав. Грысевіч,—плян капітальнага будаўніцтва быў выкананы на 26 проц., дык у гэтым годзе за першае паўгодзьдзе выкананы на 30,6 проц. Колькасьць рабочай сілы значна ўзрасла. Калі летась у маі месяцы было занята 3 тыс. рабочых, дык сёлета ў гэтым-жа месяцы было занята 8 тыс. чалавек.

У адносінах выкананьня колькасных паказчыкаў будаўніцтва вынікі значна лепшыя, чым у мінулым годзе, але дасягненьнямі ў якасьці будаўніцтва, зьніжэньні сабекошту будаўнічага індэксу пахваліцца нельга. Мала ўвагі ўдзялялася якасным паказчыкам капітальнага будаўніцтва.

Больш увагі падрыхтоўцы кадраў

Справа з забесьпячэньнем прамысловасьці кадрамі абстаіць дрэнна. Асабліва не хапае спэцыялістых. На буйным будаўніцтве, як напрыклад, Дом Ураду і інш. усяго з інжынэраў, гэта колькасьць ні ў якім разе ня можа забясьпечыць пасьляховага разгортваньня будаўніцтва.

Перад партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі вострa стаіць пытаньне падрыхтоўкі кадраў. Намечана да адкрыцьця 12 фабзавучаў для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых сілы для прамысловасьці. Але і гэта мераприемства не забясьпечыць цалкам прамысловасьць. Прыдасца ще ўсё-ж адкрываць кароткатэрміновыя курсы для перакваліфікацыі рабочых, для забесьпячэньня прамысловасьці кваліфікаванай сілай.

Дрэнна з аховай працы

З аховай працы і тэхнікай бясьпекі справа на прадпрыемствах настаўлена надзвычай дрэнна.

У мінулым годзе на аховy працы і тэхніку бясьпекі было выдаткавана 514 тыс. рублёў, а ў гэтым годзе — 1.201 тыс. руб. Але гэтыя сродкі як у мінулым, так і ў гэтым годзе не скарыстоўваюцца. Напрыклад: на папяровай фабрыцы «Гэрой Працы» 2.500 рублёў, якія прадугледжаны на тэхніку бясьпекі, не скарыстаны. Таксама не скарыстаны 2.500 руб., якія прадугледжаны на вэнтыляцыю. На фабрыцы «Спартак» на тэхніку бясьпекі асигнавана 1.600 рублёў, але яны не скарыстаны. Такі самы амаль малюнак і ў рэшце прадпрыемстваў асабліва на швейнай прамысловасьці.

Прафарганізацыі павінны завастрыць на гэтым пытаньні трамадзкую думку, прыняць усе захады да поўнага скарыстаньня фонду, які вызначаны для аховы працы і тэхнікі бясьпекі, прыцягваючы вінаватых да адказнасьці.

Падрыхтуем масы жанчын да ўборачнай кампаніі

Набліжаецца ўборачная кампанія, якая мае выключнае гаспадарчае значэньне. Уборачная кампанія павінна быць шчыльна зьвязана з умацаваньнем арганізаваных калгасаў і з дальнейшай пасьляховай калектывізацыяй сялянства-серадняцкіх гаспадарак нашае рэспублікі.

Бясспрэчна, што посьпех кампаніі будзе залежаць у значнай ступені ад таго, наколькі актыўнымі ўдзельнікамі ў яе правядзеньні зьявяцца жаночыя масы.

Было-б шкодным недаацэньваць ролю жанчыны ў гэтай кампаніі. Веснавая сельска-гаспадарчая кампанія яскрава паказала, наколькі шкодным зьяўлялася недаацэнка неабходнасьці разгортваньня самай актыўнай работы сярод жанчын.

Паводле дырэктывы ЦК КП(б)Б, у мэтах мабілізацыі на актыўны ўдзел у правядзеньні ўборачнай кампаніі жаночага і калгасна-каапэрацыйнага актыву, з 20 чэрвеня па 15 ліпеня павінны быць праведзены шырокія раённыя нарады гэтага актыву. Удзельнікамі нарад, у першую чаргу, павінен зьявіцца выбарны жаночы актыў. На нарадах будуць прапрацаваны наступныя пытаньні:

1) Задачы сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі і бліжэйшыя практычныя задачы дэлегацкіх сходаў.

2) Канкрэтныя задачы падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі і роля жаночага актыву ў яе правядзеньні.

На гэтых нарадах трэба падрабязна абгаварыць канкрэтны плян практычнага ўдзелу дэлегацкіх сходаў і жаночага актыву ў правядзеньні ўборачнай кампаніі. Задача нашай арганізацыі—адносьціся са ўсёй сур'ёзнасьцю да падрыхтоўкі і правядзеньня нарад жаночага актыву. Райвыканкомы, калгасасюзы, каапэрацыя, групы беднаты і сельсаветы павінны не фармальна прымаць удзел у нарадах, а добра да іх падрыхтавацца, пазнаёміць жаночы актыў з тымі мерапрыемствамі, якія вызначаюцца па іх лініі ў падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю, разам з жаночым актывам вызначыць формы і мэтады ўдзелу жанчын у гэтай важнейшай рабоце.

Трэба проста сказаць, што ў зьвязку з рэарганізацыяй партапарату і таму ліквідацыяй жаноддзелаў, як аддзелаў самастойных, у многіх месцах увага да разгортваньня работы партыі сярод работніц і сялянак паслабла. Многія забыліся пра тое, што работа сярод жанчын павінна весьціся ўсім апаратам партыі. Таму ня лішне прыпамінуць папярэджаньне т. Кагановіча па гэтым пытаньні.

«Калі-б хто-небудзь зразумеў ліквідацыю жаноддзелаў, як паслабленьне ўвагі партыі да работы сярод жанчын, калі-б сапраўды ў выніку гэтага пачалося некаторае заціраньне жанчын, дык партыя дастаткова моцна, каб даць рашучы адпор такім настроям і ўзьняць работу сярод жанчын і выпучэньне жанчын на новую вышыню, на новую ступень, якая адпавядае задачам рэканструкцыйнага пэрыяду» *).

Нарады, якія будуць праводзіцца з 20 чэрвеня, павінны садзейнічаць таму, каб не дапусьціць паслабленьне работы з жаночым актывам у летні час. Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб забясьпечыць сыстэматычную работу летам з батрачкамі і бяднякоўска-серадняцкімі масамі жанчын.

Усю падрыхтоўку і правядзеньне нарад узваліць на плечы жаночых арганізатараў было-б вялікай памылкай і фактычна зьявілася-б недаацэнкай работы сярод жанчын.

Неабходна дабіцца таго, каб усе партыйчэйкі прымалі ўдзел у падрыхтоўцы нарад і па сур'ёзнаму ставіліся гэтай справай. Адказнасьць за правядзеньне нарад жаночага актыву ускладаецца непасрэдна на акруговы і райкомы КП(б)Б.

Мабілізацыя жаночых мас на актыўны ўдзел у правядзеньні ўборачнай кампаніі—справа важная і сур'ёзная. Таму на падрыхтоўку актыўнага ўдзелу неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу і паставіць яе поравень з іншымі важнейшымі задачамі партыйнай арганізацыі.

*) Л. М. КАГАНОВІЧ: Очередные задачи партработы и реорганизация партаппарата». Стар. 52.

Рэарганізаваць сыстэму спажывецкай каапэрацыі

(З матар'ялаў Камісіі ЦКК-РСІ па чыстцы Белкаапсаюзу)

Рэканструкцыйны пэрыяд высунуў перад спажывецкай каапэрацыяй рад новых задач—барацьба за павышэньне рэальнай зарплаты рабочага, папышэньне харчовай базы, карэннае паляпшэньне грамадзкага харчаваньня, абслугоўваньне сацыялістычнага сэктару вёскі, паляпшэньне культурна-бытовай работы і г. д.

Матар'ялы камісіі па чыстцы сьведчаць аб тым, што спажывецкая каапэрацыя з гэтымі новымі задачамі вельмі слаба спраўляецца.

Адной з асноўных прычын слабой работы каапэрацыі на гэтых вучастках зьяўляецца абсалютная непрыстасаванасьць арганізацыйных форм і мэтадаў працы спажывецкай каапэрацыі да агульных тэмпаў і задач рэканструкцыйнага пэрыяду.

Складаная, нерацыянальная арганізацыйная пабудова спажывецкай каапэрацыі—крама—спажтаварыства або Цэнтрабкоп—аддзяленьне райсаюзу—райсаюз—Белкаапсаюз—Маскоўская кантора і г. д. параліжуе ініцыятыву і самадзейнасьць каапэрацыі.

Дырэктыва Белкаапсаюзу і бяз гэтага адарваная ад низавой практыкі яшчэ больш затушоўваецца ў прамежных зьвеньнях, а низавая практыка, вопыт працы, на падставе чаго павінны будавацца дырэктывы, плян і кіраваньне,—ня могуць прасякнуць праз сьцены райсаюзу, аддзяленьняў і розных кантор у кіруючы цэнтр беларускай спажывецкай каапэрацыі.

Асобныя зьвеньні спажывецкай каапэрацыі ў С.-Ц.-цьбе за гаспадарчую «самастойнасьць» і ініцыятыву часта проста [illegible] адно другому і падпарадкавалі сваю работу камэрцыйна-гандлёвым інтарэсам, а не агульным інтарэсам народнае гаспадаркі.

Складаны шлях тавару праз шматлікія зьвеньні ад фабрыкі да спажыўца каштуе рабочаму, селяніну мільёны рублёў і б'е па яго рэальнай зарплаце. Адзінка тавару, якая каштуе Белкаапсаюзу рубель, арабіўшы шлях праз усе зьвеньні беларускай спажывецкай каапэрацыі, каштуе гарадзкому спажыўцу некарыснасьці існуючай зараз арганізацыйнай пабудовы сыстэмы і высоўвае пытаньне аб неабходнасьці безадкладнай і карэннай рэарганізацыі сыстэмы спажывецкай каапэрацыі.

***

На якіх-жа прынцыпах павінна быць праведзена рэарганізацыя сыстэмы каапэрацыі?

Асноўнай прадпасылкай зьяўляецца рост і ўзмацненьне низавога зьвяна спажывецкай каапэрацыі. Калі на 1-X 1927 г. было 652 спажывецкія таварыствы з сярэдняй колькасьцю крам у 2,7 на адно таварыства, дык на 1-IV 30 г. колькасьць таварыстваў упала да 280 з сярэдняй колькасьцю крам на адно таварыства ў 9,9 Удзельная вага спажывецкага таварыства са зваротам [illegible] 650 тыс. руб. вырасла з 3 проц. на 1-X 28 г. да 9,2 проц. на 1-X 1929 г.

Карэнныя эканоміцы сельскае гаспадаркі, у сувязі з яе сацыялістычнай перабудовай, таксама выклікалі неабходнасьць узбуйненьня низавога зьвяна.

Працэс узбуйненьня низавога зьвяна спажывецкай каапэрацыі павінен давесьці спажывецкае таварыства да разьмераў раённага спажывецкага таварыства, прыстасоўна да адміністрацыйнага падзелу нашай рэспублікі.

Гэткая рэарганізацыя низавога зьвена высоўвае раённае спажывецкае таварыства на месца апэрацыйнага праваднікa ўсёй каапэрацыйнай працы, тым самым павялічваючы яго працаздольнасьць, самадзейнасьць і ініцыятыву. Узбуйненьне спажывецкага таварыства да разьмераў раённага дасьць магчымасьць правесьці рашучую рэарганізацыю таварапрасоўваньня.

Пры існуючым зараз становішчы 90 проц. усёй таварнай масы рэалізуецца дробнымі спажывецкімі таварыствамі, якія забясьпечваліся ў разьмеры 80 проц. свайго спажываньня праз склады сярэдняга акруговага зьвяна.

Такія складаныя і нерацыянальныя шляхі таварапрасоўваньня ні ў якай меры ня ўзьвяваюцца з тым значным ростам плянавасьці ва ўсім таваразвароце, калі «выпадковыя» закупкі і продаж, калі выпадковы цэнтралізаваны плян выкараслены цэнтралізаваным плянам разьмеркаваньня.

Асноўнымі функцыямі гэтай ячэйкі будзе—параённае плянаваньне, агульны інструктаж і кантроль за выкананьнем арганізацыйна-гаспадарчых дырэктыў Белкаапсаюзу.

***

Эфэкт ад такой рэарганізацыі і акруговага зьвяна вялізны.

Ліквідацыя цэлага зьвяна і спрашчэньне ўзаемаадносін між зьвеньнямі прывядзе да выразнага падзяленьня працы.

Ліквідацыя акруговых саюзаў, як прамежных апэрацыйна-гаспадарчых зьвеньняў, наблізіць асноўнага выканаўцу-нізоўку да Белкаапсаюзу і тым самым практыка работы нізоўкі і яе вопыт, сыгналізацыя зьнізу стане адной з асноў апэрацыйнага кіраўніцтва і плянаваньня Белкаапсаюзу.

Гэта рэарганізацыя дасьць таксама значны матар'яльны эфэкт, паводле асьцярожных падлікаў камісіі ЦКК-РСІ, мінімум у 2 міл. рублёў у год. Адзін толькі райсаюз браў 3,75 проц. накідак з нізоўкі за тавары, якія ёй перадаваў. Пры гэтым 2,75 проц. зьедаў апарат райсаюзу і адзін процант заставаўся ў выглядзе прыбытку.

Будзе атрымана таксама эканомія на адміністрацыйна-гаспадарчых выдатках у разьмеры 740 тыс. руб., на процантах на капітал 325 тыс. і на розных накладных выдатках, у сувязі з выпраўленьнем шляхоў тавара-прасоўваньня, 1-1,5 міл. руб. Такім чынам, і гэты разьлік гаворыць аб эканоміі звыш 2 міл. рублёў.

Рэарганізацыя низавога і акруговага зьвяна дасьць таксама эканомію ў кадрах: пры павялічэньні раённага апарату на 365 адзінак усё-ж будзе агульнае скарачэньне на 240 чалавек, у асабліваści рахунковых працаўнікоў, у якіх краіна адчувае патрэбу.

***

Натуральна, што рэарганізацыя низавога і ліквідацыя акруговага зьвеньняў, як акруговых гаспадарчых цэнтраў спажывецкай каапэрацыі, выклікае неабходнасьць карэннага перагляду структуры і функцый самага Белкаапсаюзу. Гэта пытаньне насьпела яшчэ таксама і таму, што структура апарату Белкаапсаюзу блытаная і ні ў якай меры не адбівае новых задач спажывецкай каапэрацыі. Вось прыклады. За адказьнейшую ў сучасны момант справу забясьпячэньня віхто ў Белкаапсаюзе на сутнасьці не нясе адказнасьці, бо пытаньні клясавасьці разьмеркаваньня і нармаваньня тавараў распрацоўваюцца арганізацыйным аддзелам, пытаньні разьмеркаваньня «наогул»—у [illegible] аддзелах, пытаньні рабочага забясьпячэньня—у Белрабсэкцыі, і г. д. У выніку блытаніна і няма адказнай асобы за ўсю справу. З 220 чалавек, якія працуюць у Белкаапсаюзе, толькі 15 чалавек займаюцца рабочым забясьпячэньнем, 4 асобы—грамадзкім харчаваньнем, за тое ў бухгальтэрыі працуюць 44 чалавекі, у канцылярыі—25 чалавек.

Ва ўмовах дэцэнтралізацыі і карэннага зьмяненьня форм апэрацыйнай работы неабходна правесьці рэарганізацыю апарату Белкаапсаюзу, ператварыць яго ў кіруючы і арганізуючы цэнтр спажывецкай каапэрацыі БССР.

У цэнтры ўвагі Белкаапсаюзу замест дробнай апекі над працай сыстэмы і часта гандлёвых функцый, павінны стаць арганізацыя і сапраўднае кіраўніцтва тымі новымі задачамі, якія высунуты перад спажывецкай каапэрацыяй умовамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

Неабходна ліквідаваць Белрабсэкцыю, як зусім неапраўдаўшую сябе функцыянальную адзінку. Пытаньне рабочага забясьпячэньня павінна стаяць у цэнтры ўвагі ўсёй спажывецкай каапэрацыі, як асноўная і галоўная яе задача.

Праца апэрацыйных сэктараў павінна быць пабудавана так, каб яны поўнасьцю адбівалі пераход спажывецкай каапэрацыі ад функцый тэхнічнага разьмеркаваньня таварных мас, да ролі арганізатара забясьпячэньня сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі.

Усе гэтыя моманты ляглі ў аснову праекту рэарганізацыі Белкаапсаюзу, які распрацаваны камісіяй па чыстцы.

Паводле гэтага праекту Белкаапсаюз павінен мець толькі 11 сэктараў. З 160 чалавек новага апарату Белкаапсаюзу прадугледжаны 32 адказныя пасады для рабочых-вулучэнцаў.

***

Натуральна, што рэарганізацыя зьвязана з радам сур'ёзных труднасьцяй: адсутнасьць кадраў для райспажтавариства, ломка апарату і г. д., але мы ні ў якім выпадку не павінны палохацца гэтых вузкіх месц. Каапэрацыя павінна неадкладна і энэргічна перамагчы іх, бо толькі карэнная рэарганізацыя апарату забясьпечыць выкананьне задач, вызначаных пастановай ЦК УсеКП(б) за 15 мая 1930 г.: «Барацьба за сапраўднае забясьпячэньне працоўных мас гораду і вёскі, за карэнную перабудову быту працоўных, за павышэньне рэальнай зарплаты рабочага, за здавальненьне новых патрэб, якія ўзьнікаюць у сувязі з калектывізацыяй мільёнаў сялянскіх гаспадарак».

Барыс Яшчэй.

Склады не падрыхтаваны да прыёму хлеба

Посьпех хлебазагатовак гэтага году ў значнай ступені залежыць ад своечасовай падрыхтоўкі загатоўчай сеткі, элеватараў, складаў і тары. Адным з істотных недахопаў кампаніі мінулага году якраз і была не адпаведнасьць ёмкасьці годных складачных памяшканьняў хлебным лішкам.

Усё гэта прымушае завастрыць увагу ўсёй грамадзкасьці на падрыхтаванасьці складзкіх памяшканьняў да бесьпераебойнага, хуткага і плянавага прыёму збожжа.

Як-жа абстаіць гэта справа? Далёка ня добра!

Уся асноўная хлебная складзкая гаспадарка Беларусі належыць Саюзхлебу. У мінулым годзе ёмкасьць складаў раўнялася 127 тысячам тон. Сёлета ёмкасьць складаў значна павялічваецца—будуецца 29 новых складаў і 2 элеватары. Але нават пры выкананьні пляну ўсё-ж будзе дэфіцыт у складзкіх памяшканьнях.

Трэба яшчэ ўлічыць, што значная частка старых складаў патрабуе пераабсталяваньня, рамонту і іх рацыяналізацыі.

Што датычыць рамонту, дык у самім «Саюзхлебе» сумняваюцца ў магчымасьці адрамантаваньня ўсіх складаў да пачатку хлебазагатовак.

У «Саюзхлебе» наогул ня ведаюць, колькі складаў на Беларусі патрабуюць рамонту.

Выяўляецца вялікі недахват пурак (апараты для вызначэньня якасьці збожжа). Не хапае вагі. Патрабуецца 60 вялікіх ваг для новых складаў.

Ці будуць забясьпечаны склады да новай загатоўчай кампаніі пуркамі і вагой?

— Усё залежыць ад таго, як маскоўскія арганізацыі выканаюць свае заданьні—адказваюць у «Саюзхлебе».

«Саюзхлеб» ня прыняў энэргічных мер да таго, каб высьветліць магчымасьць вырабу тэтых [illegible] на мэталяапрацоўчых заводах Беларусі.

Яшчэ дагэтуль не ўрэгулявана пытаньне з тарай. Спажывецкая каапэрацыя Беларусі і іншыя гаспадарчыя арганізацыі, у якіх знаходзіцца вялікая колькасьць мяшкоў Саюзхлеба, іх не вараюць. За апошні тыдзень у Саюзхлеб не паступіў ні адзін мяшок, у той час, як на руках гэтай арганізацыі знаходзіцца каля 300.000 мяшкоў.

Каапэрацыя замест таго, каб выкапаць дырэктыву Цэнтрасаюзу аб звароце «Саюзхлебу» яго мяшкоў, выкарыстоўвае гэтыя мяшкі для сваіх патрэб.

Рамонт тары праходзіць нездавальняюча. Саюзхлеб выпісаў для Віцебскай мяшковай рамонтнай базы 6 швейных машын і адну выбіральную. Але гэтыя машыны яшчэ ня прывезены. На базе працуе 17 чалавек. Рамонт мяшка каштуе 5 з палов. кап. у той час, як пры мэханізацыі работы, кошт рамонту можна было-б зьнізіць на 50 проц. Апрача таго, можна было-б значна павялічыць пакупную здольнасьць віцебскай базы.

Нездавальняюча са шпагатам. Тэкстыльгандлю дана заўдача на 27 тысяч кілёграм вязальнага шпагату і 28 тысяч кілёграм зашыўнога шпагату. Аднак шпагат дагэтуль не паступае.

Аб чым гаварыць падрыхтаваны фасты? Аб тым, што на вучастку падрыхтоўкі да хлебазагатовчай кампаніі ня ўсё добра. «Саюзхлебу» пры дапамозе грамадзкасьці трэба безадкладна разгарнуць ударную работу на [illegible] ўдар складаў, рамонт [illegible] старых [illegible] новых.

У ЦІСКОХ БЮРАКРАТЫЗМУ

Кансерватызм і коснасьць гаспадарнікаў зрываюць ажыцьцяўленьне каштоўнейшай вынаходкі

Яшчэ год назад ... неабходныя для мэханізацыі будаўніцтва ... ных работ растворамяшалак і ўвозіліся з Нямеччыны. Зараз вырабам іх займаецца адзіны ў СССР завод «Пралетарый».

Асноўным заказчыкам гэтых растворамяшалак зьяўляецца трэст «Строймеханизация» ў Маскве. Завод «Пралетарый» пастаўляе растворамяшалкі і для буйнейшага Магнітагорскага будаўніцтва.

Вынаходка т. Рабіновіча

Рабочы - сьлесар ударнік, т. Д. Рабіновіч, зацікавіўся канструкцыяй гэтых растворамяшалак. Ён заўважыў рад непатрэбных частак у нямецкай канструкцыі і пачаў працаваць над яе ўдасканаленьнем. Увагу тав. Рабіновіча прыцягнула ланцуговая перадача растворамяшалак. Гэты ланцуг на працягу 2-х тыдняў працы ўжо расьцягваецца і псуецца. Прадукцыйнасьць гэтай растворамяшалкі нізкая і яна заўсёды «капрызьнічае».

У кастрычніку мінулага году т. Рабіновіч распрацаваў праект зьмены канструкцыі растворамяшалкі, які значна пытаньне і спрашчае канструкцыю машыны. Ён прапанаваў замяніць ланцуговую перадачу шасьцёрнай, адначасова давяўшы тыцяньню машыны на 200 мм., пры зьніжэньні вышыні машына будзе больш устойлівай.

Паводле самых мінімальных падлікаў, праект тав. Рабіновіча павінен быў даць у год эканоміі 100.000 руб., не гаворачы ўжо аб росьце прадукцыйнасьці працы і эканоміі жалеза.

Скрозь рагаткі цягавіны

Прапанова тав. Рабіновіча адразу-ж натыкнулася на рагаткі роўнадушных адносін адміністрацыі, партыйных і прафэсыянальных арганізацый заводу.

Замест таго, каб выканаць дырэктывы партыі аб патаненьні сабекошту будаўніцтва, аб мэханізацыі будаўнічых работ, заводакіраўніцтва адказала вынаходцы, што завод ня мае права зьмяніць канструкцыі машын, што ён выконвае заказы трэсту «Строймеханизация» па прысланых чарцяжох. Праўда, заводакіраўніцтва абяцала напісаць у Маскву ліст, але абяцаньне засталося толькі абяцаньнем. Ды гэта не ўпярыню. **Заводакіраўніцтва прыняло 182 прапановы рабочых і ні адной з іх ня выканала.** У часе самаправеркі былі атрыманы яшчэ 200 прапаноў, але яны марынуюцца дагэтуль. Тав. Рабіновіч зварачаўся да старшыні вытворчай нарады, але і той не зьвярнуў увагі на прапанову вынаходцы.

Афэрысты Палубоцька

У студзені г. г. на завод прыехаў прадстаўнік трэсту «Строймеханизация» **Палубоцька.** Да яго зьвярнуўся тав. Рабіновіч і паведаміў аб праскце. Замест падтрыманьня Палубоцька накінуўся на Рабіновіча: «што гэта вы ўздумалі папраўляць нямецкіх інжынэраў, дзе нам угнацца за перадавой замежнай тэхнікай».

Усё такі Палубоцька напрасіў вынаходцу даць яму на адзін дзень эскізы праекту для азнаямленьня. На другі дзень зьнік прадстаўнік трэсту, а разам з ім зьніклі і эскізы.

Толькі праз паўтара месяца зьявіўся Палубоцька на завод «Пралетары» і прапанаваў... новую канструкцыю растворамяшалкі. Калі рабочыя азнаёміліся з праектам Палубоцька, яны ўбачылі, што ён проста выманіў эскізы тав. Рабіновіча і выкарыстаў чужую вынаходку. Рабочыя прагналі з заводу прадстаўніка трэсту.

На мёртвым пункце

Тав. Рабіновіч за свой кошт паехаў у Маскву і зьявіўся ў бюро садзейства вынаходству. Там якраз абгаворваўся праект Рабіновіча, прадстаўлены Палубоцькам. Тав. Рабіновіч выкрыў афэрыстага. Яго вынаходзтва было ўхвалена і ўсе прапановы прыняты, але бюро нічога не зрабіла, каб рэалізаваць каштоўную вынаходку.

Тав. Рабіновіч, прыехаўшы з Масквы, пры дапамозе ўдарнай брыгады, прыступіў да збору растворамяшалкі сваёй канструкцыі. На працягу двух тыдняў ён займаўся зборам дэталяй. Зараз машына стаіць на дварэ заводу «Пралетары» і кожны можа ўпэўніцца ў яе перавагах. Тэхнічна - інжынэрны склад заводу зараз падтрымлівае вынаходцу. **Але ўсё-ж растворамяшалкі робяцца па старой нямецкай канструкцыі; выкідваюцца на вецер дзесяткі тысяч рублёў.**

Бюракраты з трэсту «Строймеханизация» рашуча адмаўляюцца пайсьці насустрач вынаходцы.

В. ЛЕВІН.

САМАПРАВЕРКА САЦСПАБОРНІЦТВА... МІМА САЦСПАБОРНІЦТВА

Чаму самаправерка на фабрыцы „Вэзуві" не дала станоўчых вынікаў

ПАТРАБУЕМ ПАУТОРНАЙ САМАПРАВЕРКІ

ПАЛОВА РАБОЧЫХ—У БАКУ

Самаправерка выкананьня сацспаборніцтва на запалкавай фабрыцы «Вэзуві» (Нова-Беліца), ня гледзячы на ўдзел у яе 235 чалавек, **не дала належных вынікаў.** Самаправерка на «Вэзуві» паказвае, як фабрычна-заводзкія арганізацыі могуць **сарваць ініцыятыву мас,** як адсутнасьць кіраўніцтва можа ўсё работу значнай часткі калектыву **прывесьці да адмоўных вынікаў.**

У самаправерцы на «Вэзуві» прынялі ўдзел 28 брыгад з 170 добраахвотнікамі, 6 пэхавых часовых кантрольных камісій з 46 удзельнікамі і агульна-фабрычная часовая кантрольная камісія з 17 чалавек. Але **кіраўніцтва** ўсёй гэтай масай добраахвотнікаў з боку **фабрычных арганізацый** было далёка невыстарчальным. У выніку пэхавыя часовыя кантрольныя камісіі і брыгады добраахвотнікаў **ня здолелі згрупаваць вакол сябе ўсю масу рабочых і дабіцца пералому ў выкананьні прамфінпляну.** У працэсе праверкі **ні былі выяўлены ўсе недахопы ў рабоце цэхаў,** а выяўленыя недахопы **ня былі абгавораны на рабочых сходах.** Досыць паказаць, што пры абгаварэньні вывадаў ЧКК (часовых кантрольных камісій) прысутнічала ўсяго **59 проц. рабочых.** Гэта азначае, што 41 проц. рабочых, амаль палова, нават **не азнаёмлены з вынікамі самаправеркі.** Віна за гэта прыпадае выключна на цэхавыя арганізацыі, якія не мабілізавалі ўсіх рабочых вакол самаправеркі выкананьня сацдагавораў.

ПРАФ—І ПАРТАКТЫЎ СПАЎ

Вялікім недахопам у самаправерцы зьяўляецца таксама вусім невыстарчальны ўдзел у рабоце добраахвотных брыгад **партыйцаў, камсамольцаў і прафэсыянальнага актыву.** Зразумела, гэта адмоўна адбілася на больш поўным выяўленьні як станоўчых, так і адмоўных бакоў у рабоце прадпрыемства.

Самаправерка выкананьня сацдагавору і ўдарніцтва была так пастаўлена, што адна з асноўных задач цэхавых ЧКК і добраахвотных брыгад—**выяўленьне інжэ-ўдарнікаў і дакладны ўлік ударных брыгад**—ня была выканана. Нават у кашы самаправеркі такіх матар'ялаў у ЧКК **ня было.**

І наогул—аб тэмпах самаправеркі. Хоць самаправерка, якая пачалася **ў сярэдзіне красавіка,** была скончана **ў сярэдзіне мая,** але вывады агульна-фабрычнай ЧКК былі апублікаваны ў фабрычнай газэце «Трускі» толькі 6-га чэрвеня. І па сёньняшні дзень на фабрыцы **ня прыступлена да выкананьня шматлікіх прапаноў ЧКК,** ня гледзячы на тое, што «Трускі», зьмяшчаючы гэтыя вывады 6-га чэрвеня, спыталася—**«Няўжо вывады ЧКК па самаправерцы чакае тая-ж блёкада бязьдзейнасьці, як і ранейшыя прапановы рабочых?»**

ПАСЬЛЯ САМАПРАВЕРКІ—НОВЫ ПРАРЫЎ

Але справа ня толькі ў тым, што ЧКК спазьнілася з апублікаваньнем сваіх вываду. Асноўная бяда ў тым, што ў часе самаправеркі **ня былі мабілізаваны рабочыя масы на барацьбу за выкананьне прамфінплану.** Гэта асабліва пацьвярджаюць лічбы выкананьня прамфінпляну **да і пасьля** самаправеркі. Калі фабрыка за красавік выканала сваю вытворчую праграму па запалках **на 98,6 проц.,** дык за май праграма выкананa ўсяго **на 85,2 проц.** Вось лічба, якая бяз лішніх слоў сьведчыць аб **якасьці** самаправеркі. Асноўнага, што трэба было чакаць ад самаправеркі,—значнага пералому ў выкананьні прамфінпляну, **яна не дала.** І калі мы падыходзім да ацэнкі самаправеркі, дык гэты асноўны яе недахоп зводзіць самаправерку амаль што да нуля.

ШТО БРЫГАДЫ ВЫЯВІЛІ

Але ўсё-ж самаправерачныя брыгады, ня гледзячы на адсутнасьць выстарчальнага кіраўніцтва, выявілі шмат недахопаў і ўнесьлі рад дзелавых практычных прапаноў, **ажыцьцяўленьне якіх павінна ўнесьці значнае паляпшэньне ў работу асобных цэхаў.** Гэта ў тым выпадку, калі фабрычная адміністрацыя і арганізацыі неадкладна возьмуцца за выкананьне прапаноў добраахвотных брыгад і ЧКК.

Што-ж выявілі брыгады добраахвотнікаў? Галоўнае—**прамфінплян за першае паўгодзьдзе ня выканан па ўсіх паказальніках.** Чаму? **Па-першае,** з прычыны невыстарчальна выразнага кіраўніцтва з боку адміністрацыі, **па-другое,** прафарганізацыя не перабудавала сваёй работы і поўнасьцю не павярнулася тварам да вытворчасьці, **па-трэцяе,** партыйная і камсамольская арганізацыі не перайшлі на сапраўды ўдарныя тэмпы, **па-чацьвертае,** ня было належнага кіраўніцтва сацспаборніцтвам, **па-пятае,** маса несвачасова мабілізавалася на хутчэйшую ліквідацыю прарываў і г. д. З прычыны нераспарадчасьці заводакіраўніцтва ў рабоце цэхаў пазіралася шмат нязвязак, якія выклікалі тэхнічныя прастоі і звышнормавыя работы. Вытворчая праграма багучага гаспадарчага году патрабавала павялічэньня рабочай сілы. Між тым, заводакіраўніцтва амаль ніякіх мер для падрыхтоўкі рабсілы не прыняло. І цяпер яшчэ справа з падрыхтоўкай кадраў стаіць вельмі востра. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы, вызначаныя прамфінплянам, ня выканаены, а тое, што зроблена (падсушка каробак, канвэер на ўпакоўцы) не далі ніякага эфэкту. Прапановы рабочых амаль ня выконваюцца, а калі і выконваюцца, дык аб гэтым рабочыя **не інфармуюцца.**

1.306 УДАРНІКАЎ, АЛЕ...

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня былі скарыстаны фабрычнымі арганізацыямі для ліквідацыі недахопаў і ўзмацненьня прадцысцыпліны. Ня гледзячы на тое, што на фабрыцы ёсьць **127 ударных брыгад,** якія аб'ядноўваюць **1.306 ударнікаў,** у цэхах ёсьць **шмат выпадкаў грубага парушэньня працдысцыпліны.** Арганізацыя ўдарных брыгад ішла **ў кампанейскім парадку.** Ва ўдарныя брыгады запісваліся цэлымі групамі, прычым ніякіх канкрэтных абавязацельстваў некаторыя групы на сябе ня бралі. Цэхавыя арганізацыі да гэтага часу ня маюць уліку складу ўдарных брыгад і ня кіруюць імі. Пасьля стварэньня ўдарных брыгад ніхто ня цікавіўся іх работай і далейшым ростам. Цэхавыя прафарганізацыі і вытворчыя камісіі лічылі, што **кіраўніцтва ўдарнікамі ня іх справа.** Што датычыць фабкому і агульна-фабрычнай вытворчай камісіі, дык **кіраўніцтва з іх боку ўдарнымі брыгадамі было зусім невыстарчальнае.** Таксама ня прымала ўдзелу ў рабоце ўдарных брыгад ячэйка інжынэрна-тэхнічных работнікаў, што нават выклікала **роспуск бюро ІТР.** Многія ўдарныя брыгады зразумелі сваё прызначэньне фармальна: ударнікі не вялі змаганьня з прагульшчыкамі, з парушальнікамі правіл унутранога распарадку, не стваралі грамадзкай думкі вакол выкананьня прамфінпляну. Абясьцёшы сябе ўдарнымі, фанэрны завод, каробачны і накатна-макальны цэхі, а таксама майстэрня на практыцы ня выканалі ўзятых на сябе абавязацельстваў. Наяўнасьць вялікай колькасьці прагулаў, шмат выпадкаў нядобрасумленных адносін да работы, невыстарчальны ўдзел у вытворчым жыцьці фабрыкі прымусілі ЧКК паставіць пытаньне **аб пазбаўленьні іх годнасьці ўдарных цэхаў.**

АБ АСНОЎНЫМ ЗАБЫЛІ

Вось што выявілі брыгады добраахвотнікаў і ЧКК. Чаго яны **ня выявілі?** Пытаньне, як быццам, некалькі дзіўнае. Між тым, пытаньне зусім законнае, бо брыгады добраахвотнікаў і ЧКК, па нашай думцы, ня выявілі **асноўнага,** а іменна **як-жа выконваецца сацдагавор, як ідзе сацспаборніцтва, хто ў сацспаборніцтве ідзе наперадзе, хто адстае.** Гэтага ў вывадах няма, хоць у іх ёсьць нават спэцыяльны разьдзел «Сацспаборніцтва», але ў гэтым разьдзеле—ні аднаго слова аб сацспаборніцтве. Гэта зноў такі трэба адносіць за кошт **невыстарчальнага кіраўніцтва** самаправерачнымі брыгадамі з боку фабрычных арганізацый.

ЯШЧЭ РАЗ ПРАВЕРЫЦЬ!

Падагульваючы рэзультаты самаправеркі на фабрыцы «Вэзуві», прыходзіцца зрабіць вывад, што самаправерка **не дала таго, што можна і трэба было ад яе чакаць:** яна не дала рашучага пералому ў выкананьні прамфінпляну, ня выявіла поўнасьцю ўсіх недахопаў у рабоце прадпрыемства. Яна прайшла міма такога важнага пытаньня, як **сацспаборніцтва** і не мабілізавала масы на барацьбу з недахопамі, на разьвіцьцё сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Таму мы ставім перад адпаведнымі арганізацыямі, у першую чаргу перад ЦП саюзу хэмікаў, пытаньне аб **паўторнай самаправерцы** выкананьня сацдагавору і прамфінпляну на фабрыцы «Вэзуві». Паўторная самаправерка, **улічыўшы ўсе недахопы праведзенай самаправеркі,** дала-б магчымасьць сапраўды мабілізаваць масы на выкананьне прамфінпляну і палепшыць кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

П-н.

МЕНСК

СЬВЯТКАВАНЬНЕ ДНЯ 11-га ЛІПЕНЯ

Прэзыдыум ЦВК БССР абвясьціў дзень 10-й гадавіны вызваленьня БССР—11-га ліпеня сьвяточным днём для ўсіх рабочых і служачых. 10-га ліпеня, напярэдадні сьвята, павінны быць праведзены ўрачыстыя пасяджэньні, прысьвечаныя дню 11-га ліпеня. Як падрыхтоўка да сьвята, так і само сьвята павінна насіць масавы характар.

ГЭРОЙ ПРАЦЫ

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў надаць годнасьць гэроя працы тав. **З. Пінкову,** рабочаму - сьлесару Віцебскага заводу «Чырвоны Мэталісты». Тав. Пінкоў мае 35-гадовы вытворчы стаж, прымаў у часе службы ў былой царскай арміі ўдзел у рэвалюцыйным руху. Атрымаў прэміі за вынаходкі.

ПАСЬВЕДЧАНЬНІ БЫЛЫМ ЧЫРВОНАГВАРДЗЕЙЦАМ І ЧЫРВОНЫМ ПАРТЫЗАНАМ

ЦВК БССР зацьвердзіў пастанову аб нарадку выдачы пасьведчаньняў па атрыманьне ільгот былым чырвонагвардзейцам і чырвоным партызанам і іх сем'ям. Пры гарсаветах і райвыканкомах арганізуюцца спэцыяльныя камісіі для падрыхтоўкі спраў адносна выдачы пасьведчаньняў. У вясковых мясцовасьцях для атрыманьня пасьведчаньняў трэба падаць заяву ў сельсавет. Сельсавет перасылае гэтыя заявы са сваім заключэньнем і матар'ялямі ў райвыканком. Для атрыманьня пасьведчаньняў у гарадох трэба падаваць заявы ў гарсавет. Пасьля 1-га Кастрычніка ўсе старыя пасьведчаньні скасоўваюцца.

УДЗЕЛ ЖАНЧЫН ВА ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ

Прэзыдыум ЦВК запрапанаваў усім райвыканкомам у працягу чэрвеня склікаць шырокія нарады актывістак - жанчын і абгаварыць з імі пытаньні аб бліжэйшых задачах калгаснага будаўніцтва і аб канкрэтных мерапрыемствах па правядзеньні ўборачнай кампаніі.

Калі МЦРК стане тварам да спажыўца?

Ад працаздольнасьці рабочай каапэрацыі вельмі многае залежыць у справе правільнай пастаноўкі рабочага забесьпячэньня і тым самым выкананьня дырэктыў партыі аб павышэньні рэальнай заработнай платы.

Як-жа **МЦРК** выконвае гэтыя дырэктывы?

Мы спынімся толькі на двух пытаньнях: грамадзкае харчаваньне і гародняя справа.

Грамадзкаму харчаваньню, асабліва за апошні час, аддаецца вялікая ўвага. Праведзены масавы агляд грамадзкага харчаваньня паказаў, што МЦРК пытаньні грамадзкага харчаваньня вырашае не па-баявому, не паўдарнаму. **МЦРК** ня можа сёньня падаць хоць-бы адзін прыклад, з якога відна было-б, што справа грамадзкага харчаваньня палепшылася. Рабочыя брыгады, якія правяралі становішча грамадзкага харчаваньня ў **Менску,** пагалоўна ўсе ў сваіх вывадах адзначаюць, што якасьць грамадзкага харчаваньня не паляпшаецца, а пагаршаецца і што з боку кіруючай часткі **МЦРК** нічога ня робіцца, каб палепшыць гэту справу.

У большасьці сталовых рабочаму прыходзіцца прастайваць у чарзе на абед да 1 з пал. гадзін. МЦРК нічога ня робіць, каб падачу абедаў рацыяналізаваць, а гэта можна было-б зрабіць, напрыклад, пераводам абслугоўваючага пэрсаналу сталовак на зьдзельную аплату.

Сёлета са ўсёй сур'ёзнасьцю пастаўлена пытаньне аб арганізацыі прыгараднага гароднінства і жывёлагадоўлі. Заданьне па арганізацыі гародаў МЦРК выканаў поўнасьцю, а на арганізацыі адкормачных пунктаў і малочных фэрмаў—толькі на **60 проц.**

Рабочыя масы, парэшце, дачакаліся новай гароднінны. Але **МЦРК,** прытрымліваючыся прынцыпу—гандаль па першым месцы—прадае з крам агуркі па **35 кап. за штуку, а кілё бульбы—40 кап.,** у той час, як на прыватным рынку гэтыя прадукты можна купіць таней. Усё гэта паказвае на неабходнасьць карэнным чынам перабудаваць работу МЦРК, які не на словах, а сапраўды павінен стаць тварам да рабочага спажыўца.

Спажывец.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ

Усім сакратаром ячэек КП(б)Б і ЛКСМ Кастрыч. РК КП(б)Б. Бюро РК КП(б)Б сумесна з бюро РК ЛКСМ, у клюбе імя Леніна (ст. Менск, пас.) склікае раённую нараду з парадкам дня: недахопы ў рабоце камсамольскай арганізацыі, далейшыя задачы і партыкіраўніцтва.

На нараду павінны зьявіцца: усе члены і канд. бюро яч. ЛКСМ, піонэр-важатыя і пам. важатыя, усе прымацаваныя партыйцы ад бюро парт'ячэек да камсамольскіх ячэек. Пач. а 6 гадз. веч.

ЖАКТ № 16. Брыгада па аглядзе работы ЖАКТ'у № 16 просіць усіх жыхароў гэтага ЖАКТ'у прыняць удзел у рабоце брыгады па выяўленьні недахопаў у працы праўленьня і камісій. Брыгада заявы прымае ад жыхароў штодзенна ў канцылярыі ЖАКТ'у з 7 да 8 з пал. гадз. веч. як пісьмовыя, так і вусныя.

Мен. АК КП(б)Б. У памяці. АК КП(б)Б адбудзецца нарада сакратароў бытавых камісій наступных устаноў: МІРК, Паляводсаюзу, агракалгассаюзу, Малочсаюзу, Белжыгасаюзу, акрана, Белсельсаюзу, ЦСПСВ па пытаньні падрыхтоўкі да правядзеньня сьвяткаваньня 10-годзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў. Явка абавязкова. Пач. а 7 гадз. веч.

Ад Мен. АКК КП(б)Б. Мен. АКК выклікае для разбору партспраў на 29 чэрвеня а 18 гадз. веч. наступных т. т.: Савасьцянава М. (яч. сл. шляху МББ), Жарына Л. П. і Русачэнку Л. Л. (яч. ВСНКА), Баброўскага С. І. (яч. БДВ), Ганчарыка Б. А. (яч. Гандальбуду), Гольдмана А. А. (яч. Белсампрамсаюзу), Лабанава В. С. (ф-ка «Адраджэньне»), Памяранскага А. Я. і Тарасюка Ц. А. (яч. дэпо, тав. МББ), Храпуновіча М. Е. (яч. хэмікаў), Замчука П. С. (сл. руху МББ), Соскіна І. Б. (Белдзяржрдрукарня), Дзіканава Х. С. (галянтарэйная ф-ка), Іцковіча А. Ш. (з-д «Камунар»), Сіўца Г. В. (з-д «Камінтэрн», Барысаў), Рыжыкава К. П. (ф-ка лямпу), Пасынкоўскага Н. Х. і Плімака А. М. (гарбарня «Балышавік»), Шэйнгауза С. Л. (пчотачная ф-ка).

Акрамя памянёных т. т., павінны зьявіцца сакратары тых парт'ячэек, у якіх таварышы лічацца, а таксама старшыні правяркомаў, якія праводзілі чыстку тых ячэек.

П.Т. ЦКК КП(б)Б

паведамляе, што на паседжаньні 23-га чэрвеня г. г., а 6 з палов. гадз. веч. будуць разглядацца справы наступных таварышоў:

Грэбнева Рыгора Харытонавіча, Зіноўева Алеся Міхасёва, Мялешка Івана Вінцантава, Сьвеціча Мікалая Мацьвеява, Балаша Гаўрылы Міхайлава, Несьцярэнкі Аляксандра Купрыянава, Бук'яна Альбэрта Рыгорава, Барташэвіча Уладзімера Ігнатава, Нахмана Антона Эдвардавіча, Майкова Барыса Анапьнева, Захарэнкі Маркі Анікеева, Карпачова Сьцяпана Васільева, Давыдоўскага Васіля Рыгорава, Свадкоўскага Пятра Цімафеева, Руэіна Майсея Мэндалева, Абрамчыка Хведара Дарафеева, Караташа Янкі Сямёнава, Хрысанфава Янкі Хрысанфавіча, Гінзбурга Гэрца Пэйсахава, Каралькевіча Міхаіла Міхасёва, Ларчанкі Івана Фоміча, Зуевіча Мікалая Цімафеева, Салаўёва Пятра Сяргеева, Карпава Івана Мікітава, Лазоўскага Франца Іванава, Гаварыцеля Сідара Сьцяпанава, Коняка Арона Лейбава, Гайдука Алеся Ільічова, Юрэвіча Вайцеха Язэпава, Душчыца Абрама Лейзарава, Вольканштэйна Наума Львовіча, Аганава Міколу Цімохава, Зайцава Уладзімера Сьцяпанава.

Паданыя таварышы запрашаюцца для ўдзелу пры разглядзе іх спраў. Праезд за свой кошт. Таксама запрашаюцца старшыні праверкомаў, дзе гэтыя т. т. праходзілі чыстку і сакратары ячэек, дзе яны лічацца на вучоце і знаходзяцца ў Менску.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ У МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПОЛІТЭХНІКУМ

Заявы аб паступленьні ў Менскі Дзяржаўны Політэхнікум прымаюцца з 1-га па 25 ліпеня. **Заявы падаюцца на імя Прыймовай Камісіі Політэхнікуму**

Да заявы далучаюцца наступныя дакументы:

а) дакумант аб узросьце (матрыка),
б) дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын),
в) дакумант аб асьвеце,
г) 2 фатаграфічныя карткі,
д) дадатковае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага,
е) дакумант, які сьведчыць аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі,
ж) дапеўка, засьведчаная ніавой Савецкай арганізацыяй аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў,
з) для сялян акладны ліст, альбо засьведчаная копія з яго па сельска-гаспадарчаму падатку на 1929-30 г., а для саматужнікоў адпаведны дакумант аб палатку на 1929-30 г.
і) анкета, засьведчаная прафэсыйнымі, або савецкімі арганізацыямі.

УВАГА: 1. Ніякіх копій дакументаў ня прымаюцца за выключэньнем дакумэнту аб адносінах да вайсковай павіннасьці.

УВАГА: 2. У заяве, альбо анкеце неабходна паказаць на якім аддзяленьні і спэцыяльнасьці паступаючы жадае вучыцца.

УВАГА: 3. Да заявы неабходна прыкладаць паштовыя маркі на 25 кап. для адказу падаўцу заяў.

Узрост паступаючага ў Політэхнікум павінен быць ня ніжэй поўных 15-ці год на 1-е жніўня 1930 г. і ня вышэй 25-ці (могуць быць выключэньні ў адносінах да прыёму на узросту вышэй 25 год).

Асобы, якія скончылі, незалежна ад году скончэньня, поўны курс 9-ці гадовай прапоўнай школы, школы 2-й ступені, 2-х гадовых агульна-адукацыйных курсаў, 7-мі гадовай прапоўнай школы, школы дарослых павышанага тыпу, школы сялянскай моладзі, прафшколы і курсы на падрыхтоўцы ў тэхнікумы, зарэгістраваныя органамі НКА, роўна як вытрымаўшыя іспыты ў 1928-1929 і 1929-30 г. пры паступленьні ў політэхнікум аслабаняюцца ад усякіх іспытаў, асобы, якія ня скончылі вышэй пералічаных навучальных устаноў, павінны трымаць іспыты за курс 7-мі годкі.

УВАГА: скончыўшыя прафшколы прымаюцца пры наяўнасьці 3-гадовага вытворчага стажу пасьля скончэньня школы.

Тэрмін іспытаў і залічэньня устанаўліваецца з 1-га па 10-е жніўня. З 10—15 жніўня аб выніках прыёму паведамляюцца ўсе асобы, якія падалі заявы аб прыёме ў Політэхнікум.

УВАГА: Асобы, аслабаняемыя ад іспытаў, зусім ня прыяжджаюць і атрымоўваюць пісьмовае паведамленьне аб сваім залічэньні не пазьней 1-га верасьня.

Пры Менскім Дзяржаўным Політэхнікуме існуюць 5 аддзяленьняў:
1) Архітэктурна-будаўнічае са спэцыяльнасьцямі:
а) фабрычна-заводзкога будаўніцтва, б) жыльлёвага будаўніцтва, в) сельска-гаспадарчага будаўніцтва, г) санітарнай тэхнікі.
2) Дарожнае, па пабудове бязрэйкавых шляхоў і мастоў.
3) Гідратэхнічнае-мэліярацыя і асушэньне.
4) Хэмічнае са спэцыяльнасьцямі:
а) па харчавой прамысловасьці, б) скуравой прамысловасьці, в) буданічных матар'ялах, г) сухой перагонцы дрэва, д) шкляной прамысловасьці і е) папяровай прамысловасьці.
5) Тарфяное са спэцыяльнасьцямі:
а) па здабываньні і сельска-гаспадарчым скарыстаньні торфу б) па прамысловай пераапрацоўцы торфу.

Курс Політэхнікуму разьлічан на 3 гады.

Політэхнікум рыхтуе—тэхнікаў вытворчасьці па азначаных спэцыяльнасьцях.

Залічаныя на стыпендыю атрымліваюць права на атрыманьне інтэрнату, ці кватэрных грошай.

Дырэктар Політэхнікуму **Акодзін.**

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — Гастролі 1-га Маскоўскага перасовачнага тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ. Сёньня, 20 чэрвеня „ФАУСТ". Білеты ў касе тэатру і раб. касе. ПАЧАТАК А 8 ГАДЗ. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура" — Вясёлая камэдыя ў 6 частках. Жыцьцё зусім на ўвесь ход. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно-палітэсьвет фільм ў 2 ч. МАЛАНКА. Пач. 1-га сэансу роўна а 8 г., 2-га 10 г. Каса—ад 6 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Нямецкі фільм вытворчасьці Уфа-фільм „ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК". У галоўных ролях: Рыта Робэртс, Фрыц Кампэрс, Вілі форст. Пачатак 1-га сэансу а 7-й гадз. Каса ад 5 г.

КІНО САД (Савецкая, 71) — ПАДВОЙНАЯ ВЫДАТНАЯ ПРАГРАМА. 2 фільмы ў адзін сэанс. ВАРОТЫ КАУКАЗУ ў 6 част. ГАРОЛЬД ЛОЙД у лепшай камэд. Дзеля Прыгожых вачэй у 3 част. ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 9 ГАДЗ. Каса адчынена ад 6 гадз. увеч.

КІНО Пралетарый — Замежны мастацкі фільм ДРУГІ ШЛЮБ. кіно-драма ў 8 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса адкрыта з 5 гадз.

1-шы дзіячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Падвойная праграма. 2 фільмы ў адзін сэанс. ГІГАНТ 5 частак. СЕНЬКА АФРЫКАНЕЦ у 2 частках. Пачатак 1-га сэансу а 2 гадзіне. Каса адчынена з 12 гадз. дня.

Кіно „СПАРТАК". Ад панядзелка, 16 чэрвеня. Звыш праграмы гастролі артыстых сатыры ТВОРЦАВА І ВЛАДАВА. НА ЭКРАНЕ ПАТ і ПАТАШОН у карціне ВЫДАТНЫЯ ПАДАРОЖНІКІ. камэдыя ў 7 частках. УВАГА. Сёньня 4 сэансы. ПАЧАТАК 1 с.—6 г., 2 с.—7 г. 30 м., 3 с.—9 г., 4 с.—10 г. 45 м. КАСА—ад 5 гадз.

ХАРЬКОВСКИЙ окружной исполнительный комитет рабоче-крестьянских и красноармейских депутатов, харьковский городской совет рабочих и красноармейских депутатов и комитет содействия строительству

ОБЪЯВЛЯЮТ

ОТКРЫТЫЙ МЕЖДУНАРОДНЫЙ КОНКУРС

на составление проекта государственного театра массового музыкального зрелищного действа на 4.000 мест в г. Харькове.

ЗА ОТНОСИТЕЛЬНО ЛУЧШИЕ ПРОЕКТЫ БУДЕТ ВЫДАНО 12 ПРЕМИЙ

1-я премия	10.000	5-я премия	4.000
2-я »	8.000	6-я »	3.000
3-я »	6.000	7, 8 и 9-я	по 2.000
4-я »	5.000	10, 11 и 12	по 1.500

Срок подачи проектов 30-го декабря 1930 г.

Программу можно получить с 30 июня с. г. в

г. Харькове—в Управлении Харьковского Окружного Инженера—ул. К. Либкнехта № 7.
» В архитектурной секции клуба работников народного хозяйства.
» В обществе Современных Архитекторов Украины (ОСАУ).
г. Одессе — в Строительном Институте—улица 10-летия Красной армии № 8.
» в Одесском Архитектурном Обществе—Пушкинская ул. № 9.
г. Киеве — в Киевском Художественном Институте—улица Смирнова № 2.
» в Управлении Киевского Окружного Инженера улица Воровского № 25.
г. Днепропетровске—в Управлении Окружного Инженера
г. Москве—в Московском Архитектурном Обществе—Ермолаевск. пер. № 17.
г. Москве—в Обществе Современных Архитекторов (ОСА)—ул. Кропоткина.
г. Ленинграда—в Ленинградском Обществе Архитекторов-Художников—Университетская набережн. № 17.
г. Ленинграде—в Ленинградском Академическом Архитектурном Обществе—Мойка № 83.
г. Тифлисе—в Строительно-Техническом Комитете—Дворец-
г. Ростове н-Д—в Управлении Строительного Контроля.
г. Новосибирске—в Краевом Управлении Строительного—Контроля—Красный Проспект, Городской корпус.
г. Минске — в Управлении Строительного Контроля.
г. Баку — в Окружном Управлении Строительного Контроля—Коммунистическая ул. № 4, здание Бакин. Окрисполкома комн. № 71.
г. Эривани—в Строительном Комитете.

Заграницей: в местах и организациях по указанию Украинского общества культурных с заграницей.

По всем вопросам, касающимся настоящего международного конкурса обращаться в Управление Окружного Инженера—г. Харьков, ул. К. Либкнехта № 7, к ответственному секретарю конкурса Архитектору—**А. ЛИКЕЦКОМУ.**

Завод „Беларусь" зьвяртае ўвагу ўсіх сваіх кліентаў

НА НЕАБХОДНАСЬЦЬ

дасканалага прагляду марак на тару

пры іх прыёме.

На апошніх АБАВЯЗКОВА павінна быць трохкутная пячатка бухальтэрыі заводу, № маркі і подпісы дырэктара МОЎЧАНА і бухгальтара —ПІЛЬГРАМ

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА ЎЗЕМАДАПАМОГІ

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12

АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. веч.

Прыём хворых на ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хвароба вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.

Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечаньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.

Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзенна

Кансультацыі прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.

Дзяжурствы дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

ЖБКТ «Асьветнік Камунар» у памяшканьні Б